Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 32 (5706) | 9 лютага 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Пісьмо таварышу Сталіну ад удзельнікаў урачыстага пасяджэння Акадэміі навук БССР, прысвечанага стагодзю са дня смерці А. С. Пушкіна.

Новымі вытворчымі перамогамі адзначаюць працоўныя праект Канстытуцыі БССР.

У Саўнаркоме БССР.

Артыкулы: **Перадавы** — Рэзка ўзняць тэмпы лесазагатовак. **В. К. КІН** — Расце дзяржаўная крэдытная дапамога калгасам. **Г. Верхоўскі**—Скончылася Бабруйская партыйная канферэнцыя. **П. Кавалёў**—Канстатуюць факты парушэння Сталінскай Канстытуцыі.

Да стагоддзя са дня смерці А. С. Пушкіна: праф. **Я. А. Бранштэйн** — Горкі пра Пушкіна. Урыўкі з выбраных твораў А. С. Пушкіна: «Палтава» — пераклад **Януба Коласа**. «Медны коннік» — пераклад **Янкі Купалы**. «Руслан і Людміла»—пераклад **Андрэя Александровіча**. «XXIV» — пераклад **П. Броўкі**.

Памяці вялікага рускага хіміка Д. І. Менделеева.

У Парыж — на крос «Юманітэ».

За граніцай: Ярасныя атакі мяцежнікаў на поўдзень ад Мадрыда. Барацьба з трацкістамі ў Іспаніі. Французскі друк аб прамове Гебельса.

Прыезд у Маскву фінляндскага міністра замежных спраў.

РЭЗКА УЗНЯЦЬ ТЭМПЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК

У чацвертым квартале лесапільная і дрэваапрацоўчая прамысловасць БССР працавала з вялікімі перабоямі з-за нястачы сыравіны. Дастаткова ўказаць на тое, што некаторыя фанерныя заводы вымушаны былі пераключыцца з альхі на іншыя пароды лесу для вырабу фанеры. Прычынай таму была дрэнная работа лесазагатоўчых арганізацый, якія не выконвалі план загатовак і вывазкі лесу.

Студзень — адзін з рашаючых у лесазагатоўках і лесавывазцы месяцаў першага квартала—не толькі не забяспечыў пералому ў выкананні плана, але даў ваят значнае пагаршэнне работы лесазагатоўчых арганізацый. З 1 студзеня па 5 лютага квартальны план па загатоўках лесу выканан на 22,8 проц., па вывазцы — на 18,5 проц. Бабруйскі леспрамгас з квартальнага плана загатовак у 245 тыс. кубаметраў здолеў за студзень загатовіць толькі 45,1 тыс. кубаметраў. Полацкі леспрамгас з квартальнага плана ў 175 тыс. кубаметраў загатовіў у студзені 37,5 тыс. кубаметраў.

Прычыны прарыву? Леснікі, вядома, гатовы пусціць у ход свае старыя ўлюбёныя спасыланні на надвор'е, на адсутнасць снегу, на дажджы і т. д. Шмат хто з дырэктароў леспрамгасаў пачынаюць вытлумачваць зрыў месячнага плана нібыта тым, што першая дэкада студзеня была «мокрай». Але-ж другая і трэцяя дэкады былі выключна сприяючымі для вывазкі, чаму ў гэтыя дзве дэкады не навярстана ўпушчанае за першую?

Прычыны прарыву, вядома, не ў гэтым. Спасыланні на надвор'е толькі лішні раз характарызуюць адсталасць кіраўнікоў леспрамгасаў, што яны яшчэ знаходзяцца ў палоне старавярсковых звычак — вазіць толькі пры добрай саннай дарозе. Правал студзеньскага плана трэба шукаць у слабай арганізацыі працы і ў адсутнасці сапраўднай большэвіцкай барацьбы за найбольш эфектыўнае скарыстанне механізмаў.

А аб гэтым красамоўна сведчаць вынікі работы аўтабаз і трактарных баз. За студзень 1-5 дзён лютага квартальны план механізаванай лесавывазкі выканан толькі на 16,8 проц. Бабруйская аўтатрактарная база выканала свой план на 11 проц., бабійская трактарная база — на 15,8 проц., а чэрвеньская аўтабаза толькі на.... 0,5 проц.

Механізмы, як правіла, больш прастойваюць, як працуюць. Так, з 20 машын рэчыцкай аўтабазы ў першую пяцідзёнку лютага працавалі толькі 10, у бабруйскай не працавала 6 машын, у слуцкай — 8. Усяго па Лесбелу з 86 аўтамашын працавала 53 і з 35 трактароў працавала 22. Нават спраўныя машыны не выкарыстоўваліся з поўнай нагрузкай. У брожскім механізаваным лесапункце трактары прастойваюць пад нагрузкай па дзве—дзве з паловай гадзіны замест адной. Нярэдка трактары і аўтамашыны робяць зусім халастыя прабегі з прычыны адсутнасці загатоўленай драўніны ці рабочай сілы для нагрузкі.

Да гэтага часу леспрамгасы, ды і кіраўнікі Лесбела не могуць сабе ўявіць, што барацьба за механізацыю не вызначаецца толькі падлікам колькасці аўтамашын ці трактароў, адпраўленых у рэйс, што гэтага недастаткова яшчэ для таго, каб машыны далі поўны эфект. Адсутнасць рамонтных майстэрань, запасных частак, гаручага і змазачнага выклікае прастоі механізмаў, зрывае стаханаўскую работу, вядзе да невыканання стаханаўцамі ўзятых на сябе самаабавязацельстваў.

У чаканні добрай саннай дарогі шмат хто з кіраўнікоў леспрамгасаў не арганізоўвае калёснай вывазкі. У петрыкаўскім, глускім, лепельскім і радзе іншых леспрамгасаў не арганізоўваюць выкананне заключаных дагавароў з калгасамі і аднаасобнікамі на загатоўку і вывазку лесу.

Не адчуваецца асаблівай трывогі і ў райвыканкомах. Ельскі райвыканком, напрыклад, па неаднаразовых просьбы работнікаў леспрамгаса аб дапамозе ў арганізацыі лесавывазкі ўнадзейвае толькі абяцаннямі.

Прычыну недапушчальнага адставання лесазагатоўчых арганізацый трэба шукаць і ў тым, што тут не заўважаюць шкодніцкай работы ворага, накіраванай у першую чаргу на дыскрэдытацыю механізаванай лесавывазкі, на тое, каб перашкодзіць стаханаўцам штодзённа павышаць прадукцыйнасць працы. Нярэдка вораг карыстаецца ў сваёй шкодніцкай рабоце безгаспадарчасцю, арганізацыйнай неразбярыхай, якая панае шмат на якіх лесаўчастках. Вось чаму трэба выкрываць ворага, бязлітасна біць па ўсякіх яго спробах шкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Так далей працаваць нельга! Ніхто не даў права лесазагатоўчым арганізацыям сваёй бяздзейнасцю, няўменнем арганізаваць работу ставіць пад удар дрэваапрацоўчую прамысловасць, важнейшыя будоўлі.

Абвешчаны СНК БССР і ЦК КП(б)Б з 8 лютага месячнік загатоўкі і вывазкі лесу павінен крута ўзняць крывую выканання плана. Для гэтага патрабуецца ў першую чаргу рашучае перамаганне старавярсковых звычак, антымеханізатарскіх настрояў, коснасці і непаваротлівасці работнікаў леспрамгасаў і трэста.

Стварыць нармальныя ўмовы для работы стаханаўцаў на механізмах у лесе, штодзённа клапаціцца аб стварэнні і замацаванні на вытворчасці сталых кадраў рабочых, арганізаваць выкананне дагавароў калгасамі і аднаасобнікамі — задача леспрамгасаў і райвыканкомаў. Райкомы партыі павінны ўсямерна разгарнуць масавапалітычную работу сярод вялікай арміі лесарубаў і возчыкаў, арганізаваць іх актыўнасць на выкананне і перавыкананне планаў.

Беларускі народ перажывае радасныя дні. Ён вывучае праект Сталінскай Канстытуцыі БССР. Ва ўсіх кутках рэспублікі нарастае хваля працоўнага энтузіязма. На фабрыках і заводах, у саўгасах і калгасах вырастаюць новыя сотні, тысячы стаханаўцаў — людзей, якія штодзённа ўстанаўліваюць новыя, больш высокія рэкорды прадукцыйнасці працы. Сустрэць Паязвычайны XII З'езд Саветаў БССР рэзкім павышэннем тэмпаў лесазагатовак і вывазкі—справа гонару ўсіх рабочых і калгаснікаў БССР.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

5 лютага пад старшынствам тав. Галадзеда адбылося чарговае пасяджэнне СНК БССР. На гэтым пасяджэнні разглядаўся народнагаспадарчы план і дзяржаўны бюджэт БССР на 1937 год.

З інфармацыяй аб рабоце камісій, якія былі вылучаны Соўнаркомам для разгляду розных галін народнагаспадарчага плана, выступілі старшыні камісій тт. Любовіч, Сурта, Васэрман і Лапцеў.

Галоўная ўвага ўсіх выступаўшых па пытаннях народнагаспадарчага плана была сканцэнтравана на асноўных галінах плана, асабліва на вытворчасці, сацыялістычнай сельскай гаспадарцы, сацыяльна-культурных мерапрыемствах і інш.

Народнагаспадарчы план і дзяржаўны бюджэт БССР на 1937 год адлюстроўваюць вялікія дасягненні, якіх дабілася Совецкая Беларусь, асабліва за апошнія гады. Аб узыме ўсёй сацыялістычнай гаспадаркі рэспублікі гаворыць наступныя лічбы. Павоўле плана, у 1937 годзе будзе выпрацавана валавой прадукцыі на 2,2 мільярда, а ў мінулым годзе план складаў 1.815 мільёнаў рублёў. Сёлета прадпрыемствы былога Наркамата мясцовай прамысловасці павінны даць прадукцыі на 564,5 мільёна рублёў, што складае 24 проц. росту ў параўнанні з мінулым годам. Планам прадугледжан аб'ём валавой прадукцыі па прамысловасці РВК і горсоветаў у суме 56.199 тыс. рублёў і па прамысловай кааперацыі — 506.399 тыс. руб.

Агульны аб'ём капітальных работ па рэспубліканскай і мясцовай гаспадарцы на 1937 г. складае 146.36 мільёна рублёў супроць 130,9 мільёна рублёў у 1936 годзе. Планам прадугледжана выпрацоўка ў 1937 г. электраэнергіі ў колькасці 435 мільёнаў кіловат-гадзін, супроць 377,8 млн. кіловат-гадзін у 1936 г.

Вялікая ўвага народнагаспадарчым планам гэтага года аддадзена механізацыі і машынізацыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. У 1937 г. будзе арганізавана 23 новых МТС, для чаго будзе завезена 1.535 новых трактароў. Сёлета таксама завозіцца 450 новых камбайнаў. Такім чынам, у 1937 г. на калгасных палях рэспублікі будзе працаваць 600 камбайнаў.

У абмеркаванні народнагаспадарчага плана актыўны ўдзел прымалі старшыні горсоветаў, АВК і гаспадарнікі, якія прысутнічалі на пасяджэнні Соўнаркома.

Тав. Галадзед у сваім выступленні завастрыў асаблівую ўвагу на барацьбе за паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана БССР у 1937 г. і на тых канкрэтных задачах, якія вынікаюць з гэтага плана.

Пасля дзелавога абмену думкамі і ўнясення раду карэктыў народнагаспадарчы план БССР на 1937 г. быў зацверджан.

На пасяджэнні Соўнаркома з дакладам аб выкананні дзяржаўнага бюджэта 1936 г. і аб бюджэце 1937 г. выступіў народны камісар фінансаў БССР тав. Кудзелька. З дакладам аб дзяржаўным бюджэце 1937 г. выступіў старшыня Дзяржплана БССР тав. Любовіч.

Бюджэт Совецкай Беларусі ярка адлюстроўвае ўздым усіх галін сацыялістычнай гаспадаркі рэспублікі. Калі ў 1932 г. агульны бюджэт рэспублікі складаў 313.1 млн. руб., то ў 1937 г.—у апошнім годзе другой пяцігодкі — ён складае 940 млн. рублёў. Асноўную частку выдаткаў у бюджэце гэтага года складаюць асігнаванні на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы—677 млн. руб., у тым ліку на народную асвету — 478 млн. руб. і на ахову здароўя — 188 млн. рублёў.

Старшыня СНК БССР тав. Галадзед у сваім выступленні падкрэсліў неабходнасць строга прытрымлівацца пры выкананні бюджэта бюджэтнай дысцыпліны. Тав. Галадзед прывёў рад фактаў парушэння бюджэтнай дысцыпліны ў мінулых гадах, асабліва радам райвыканкомаў і гаспадарчымі арганізацыямі. Парушэнні бюджэтнай дысцыпліны, — кажа тав. Галадзед, — з'яўляюцца дзяржаўным злачынствам. Мы павінны дабіцца ў гэтым годзе такога становішча, каб не было ні аднаго выпадку парушэння бюджэтнай дысцыпліны ў нашай рэспубліцы.

На гэтым-жа пасяджэнні была абрана камісія ў складзе тт. Галадзеда, Любовіча Кудзелька, Геаргадзе і Галятоўскага, якой было даручана дэталёва разгледзець усе артыкулы бюджэта.

Пасля ўнясення раду карэктыў, 7 лютага дзяржаўны бюджэт БССР быў зацверджан Соўнаркомам. (БЕЛТА).

МАСКВА, ЦК ВКП(б)

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Ад імя ўдзельнікаў урачыстага пасяджэння Акадэміі навук БССР, прысвечанага стогадоваму юбілею са дня смерці вялікага рускага паэта і грамадзяніна А. С. Пушкіна, вітаем Вас, свайго роднага любімага правадыра і друга.

Юбілей Пушкіна ператварыўся ў грандыёзнае свята сацыялістычнай культуры ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза. БССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў Совецкай Беларусі, пры падтрымцы брацкага рускага народу пад Вашым кіраўніцтвам нарадзілася і вырасла ў квітнеючую перадавую ордэнаносную рэспубліку. Беларуская, нацыянальная па форме і сацыялістычная па зместу, культура вырасла і ўзмацнела пад сонцам ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Беларускаму гераічнаму народу, перажыўшаму ў нядаўнім мінулым гнёт бяспраўя, галечы і эксплаатацыі, распяваючаму зараз бадзёрыя, вясёлыя песні аб радасным жыцці, — асабліва сукучны радасныя песні жыццелюбівага Пушкіна.

Там, за пагранічнымі слупамі БССР, усяго толькі ў некалькіх дзесятках кілометраў ад нас, варварскі фашызм люта растоптвае культуру, наладжваючы сярэдневяковыя вогнішчы з твораў лепшых розумаў чалавецтва. Супроць фашысцкага варварства мы разам з вялікім Пушкіным можам толькі ўсклікнуць:

«Да здравствует разум, да скроется тьма!»

Мы запэўняем Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, што, знаходзячыся на рубяжы з капіталістычным светам, кожны з нас ёсць і будзе стойкім байцом, які ахоўвае недатыкальнасць граніц нашай свяшчэннай, любімай радзімы.

Гнеў і нянавісць народу да трацкісцкіх банды, дыверсантаў і шпіёнаў узнімае ў нас яшчэ больш палкае імкненне працаваць, лепш працаваць, паболышэвіцку, заўсёды быць напагатове, знаходзіць ворагаў усюды, дзе-б яны ні прабавалі прытаіцца.

Няхай квітнее і шырыцца магутная совецкая паэзія, спяваючая аб шчасці і радасці нашай вялікай сацыялістычнай радзімы!

Няхай жыве наш геній, наша любоў, наша гордасць — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Па даручэнню схода:
прэзідэнт Акадэміі навук БССР
акадэмік СУРТА.

ВЫДАТНАЯ ВЫСТАЎКА

ТБІЛІСІ, 7 лютага. (БЕЛТА). Учора ў былым будынку музея рэвалюцыі адкрылася пастаянная выстаўка матэрыялаў і дакументаў **«Да гісторыі большэвіцкіх арганізацый Закаўказзя і Грузіі»**. Экспанаты для выстаўкі падабраны тбіліскім філіялам інстытута Маркса—Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б).

8 вялікіх зал займаюць стэнды, якія адлюстроўваюць гісторыю рэвалюцыйнага руху, зараджэнне і ўвесь шлях барацьбы большэвіцкіх арганізацый Закаўказзя і Грузіі, выпеставаных таварышам Сталіным. Шматлікія фатаграфіі і дакументы рысуюць работу першых марксісцкіх гурткоў, арганізаваных і кіруемых таварышам Сталіным. Перыяд другога з'езда партыі паказан узорамі нелегальнага друку. Бліскуча выкананы макет паказвае да найдрабнейшых дэталей усю тэхніку першай большэвіцкай падпольнай друкарні ў Тбілісі.

Ярка адлюстраваны ў дакументах і фотаздымках роля Сталіна як правадыра і кіраўніка закаўказскіх большэвікоў, сталінская прапаганда ленінскага вучэння аб пролетарскай партыі і арганізацыйных прынцыпах большэвізма, яго кіраўніцтва ўсім большэвіцкім друкам і барацьбой супроць меншавікоў, сацыял-федаралістаў, нацыянал-дэмакратаў, анархістаў і дашнакаў.

Гады новага ўздыму рэвалюцыйнага руху ілюструюцца матэрыяламі аб рабоце большэвіцкіх арганізацый у Тбілісі, Баку, Батумі і іншых гарадах Грузіі і Закаўказзя.



У бліжэйшыя дні палярны пётчык-ордэнаносец Ф. Б. Фарых адпраўляецца на самалёце «Н-120» у вялікі трансарктычны пералёт працяжнасцю каля 20.000 кілометраў. Задача пералёту — асваенне новага трансарктычнага паветранага шляху ў цяжкіх зімовых умовах, абследванне інструктарамі «Главсевморпути» стану зімовак па ўзбярэжжу і дастаўка на зімоўкі грузаў і пошты. НА ЗДЫМКУ: падрыхтоўка самалёта «Н-120» да трансарктычнага пералёту. Фото Ф. Кіслова (СФ).

НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ
АДЗНАЧАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ПРАЕКТ КАНСТЫТУЦЫІ БССР

КАНСТЫТУЦЫЯ АДРОДЖАНАГА НАРОДУ

Працоўныя Слуцкай акругі з пачуццём вялікага задавальнення, радасці і гордасці за сваю радзіму вывучаюць праект Канстытуцыі БССР.

У Чырвонаслабодскім раёне вывучаюць праект Канстытуцыі ў 81 гуртку. У калгасах, саўгасах і на прадпрыемствах Слуцкага раёна працуюць 82 гурткі. У іх працоўныя абмяркоўваюць і вывучаюць праект Канстытуцыі адроджанага беларускага народу. Глыбокае вывучэнне пачалося ў сёлах партыйнай і комсамольскай асветы.

Вывучэнне праекта суправаджаецца вытворчым узлыманам. У адказ на Канстытуцыю работнікі свінагадоўчай фермы калгаса «1 Мая» тт. Варабей, Мастінская, Броўда, Цыганова абавязаліся атрымаць у гэтым годзе за 2 апаросы ад кожнай свінаматкі па 20 дзелавых парасят, давесці вагу аднаго апаросу да 75 кілограмаў і ў грашовым азначэнні атрымаць прыбылі па 3 тыс. рублёў.

Конюх калгаса «Пролетарская ніва» Грэскага раёна Лапеп Дзяніс гаворыць, што гістарычны дакумент беларускага народу ён адзначыць стаханаўскай работай па догляду за коньмі, не дапусціць ні аднаго аборту кабыліц і выведзе ўсё пагалоўе на палявыя работы ў выдатным становішчы.

Стаханаўскае звяно калгаса імя Леніна Слуцкага раёна абавязалася атрымаць ураджай зернавых 50 цэнтнераў і бульбы 300 цэнтнераў з гектара.

На сходзе калгаса «Волат» Вялікаслуўскага сельсовета, Слуцкага раёна, на якім абмяркоўваўся праект Канстытуцыі, думку ўсіх прысутных выказаў калгаснік Качур Р. Ён заявіў:

— Канстытуцыя БССР — дакумент шчаслівага жыцця беларускага народу. Велізарнымі перамогамі мы абавязаны вялікаму правадыру таварышу Сталіну.

Нельга не ўспомніць, як жылі мы да рэвалюцыі. Мы былі жабракамі, непісьменнымі. Нас, мужыкоў, ніхто не лічыў за людзей. Наша сучаснае жыццё, шчасце радзіму мы ніколі нікому не аддадзім.

— Ніхто, — гаворыць рабочы каўбасной фабрыкі т. Пішчук Іван, — не прадастаўлены такія гарантаваныя правы на працу, адпачынак, адукацыю, як у нашым Совецкім Саюзе. Я — былы батрак, перанёсшы ўсе жудасці эксплаатацыі і прыгнечання, не магу без хвалявання і радасці гаварыць аб свабодным, шчаслівым жыцці зараз, у сталінскую эпоху.

Стары рабочы гэтай-жа фабрыкі (гор. Слуцк) Паўлючэнка гаворыць:

— Добра помніцца жыццё рабочага ў былы час. Наш фабрыкант Бросель — крывапійца — прымушаў працаваць па 14—16 гадзін.

Члены шавецкай арцелі «Рэкорд» у адзнаку праекта Канстытуцыі значна ўзнялі прадукцыйнасць працы. Замест 100 пар абутку вырабляецца 111—113 пар. Стаханавец Кобрын дае 243 проц. нормы, Мельнік — 230 проц. і т. д.

Рабочыя гарадской электрастанцыі, промарцелі, работнікі гандлю ўхваляюць праект Канстытуцыі, рыхтуюць рапарты XII Усебеларускаму З'езду і бяруць абавязацельствы да XX гадавіны Вялікай пролетарскай рэвалюцыі выканаць план апошняга года другой пяцігодкі.

КУЛІНКОВІЧ.

ПРАВА НА АДУКАЦЫЮ

МОЗЫР. З пачуццём вялікай радасці вывучаюць студэнты мозырскага педтэхнікума праект новай Канстытуцыі БССР. Маладыя сыны і дочкі рабочых і калгаснікаў добра ведаюць, што вучацца яны ў спецыяльнай сярэдняй навучальнай установе толькі дзякуючы совецкай уладзе, якая дала ім права на адукацыю. Іх бацькі пры царскай уладзе гэтага права не мелі.

Да рэвалюцыі на тэрыторыі сучаснай Мазырскай акругі не толькі не было ні адной сярэдняй школы, але рэдка дзе былі ў вёсках пачатковыя школы. Зараз-жа на тэрыторыі кожнага сельсовета ёсць пяцігадовая сярэдняя школа, а ў раённых цэнтрах — поўныя сярэднія школы. У адным толькі Мозыры 7 пяцігадовых сярэдніх школ і 1 поўная. Педагагічны тэхнікум арганізаваўся ў 1927 годзе. За 9 год ён выпусціў 414 настаўнікаў, якія працуюць у вясковых школах Палесся. Зараз у тэхнікуме займаюцца 663 студэнты. У гэтым годзе будзе выпушчана 178 настаўнікаў. Апрача таго пры тэхнікуме працуюць курсы дашкольных работнікаў у колькасці 170 чалавек. Завочна пры тэхнікуме навучаюцца 597 чалавек.

Р. ФРАЛОЎ.

ВОРАГАМ НЕ ЎДАСЦА САРВАЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

БАБРУЙСК. Глыбокай любоўю да правадыра народаў таварыша Сталіна прасякнуты выступленні рабочых на сходах, прысвечаных вывучэнню праекта Канстытуцыі БССР.

— Дзякуючы вялікаму Сталіну, Беларусь з краіны цёмнай і прыгнечанай у царскія часы, ператварылася ў перадавую сацыялістычную рэспубліку Совецкага Саюза. Вырасла магутная прамысловасць і сацыялістычная сельская гаспадарка. У БССР квітнее сацыялістычная культура,— заявіў на сходзе калектыва рамонтна-механічнага завода імя Варашылава рабочы Мельцар.

— Ніякім ворагам ніколі не ўдасца сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва,— гаворыць рабочы Панцялееў. — Рыхтуючыся да зацвярджэння З'ездам новай Канстытуцыі БССР, мы павінны яшчэ больш узняць большэвіцкую пільнасць, выкрываць ворага, як-бы ён ні маскаваўся.

Кожны выступаўшы рабочы абавязаўся сустрэць прыняцце новай Канстытуцыі БССР далейшым павышэннем прадукцыйнасці працы.

ВЫВУЧАЮЦЬ ПРАЕКТ НОВАЙ КАНСТЫТУЦЫІ БССР

ЛОЕЎ. Ва ўсіх калгасах раёна праходзіць вывучэнне праекта новай Канстытуцыі Совецкай Беларусі. Калгаснікі ў сваіх выступленнях заяўляюць, што новая Канстытуцыя з'яўляецца шчасцем беларускага народу, яна натхняе на новыя, яшчэ большыя перамогі.

Горача дзякуе партыю і ўрад за Канстытуцыю БССР, якая будзе неўзабаве зацверджана З'ездам, старая калгасніца, знатная стаханаўка раёна Зязюля Ульяна з калгаса імя Гікало. Яна заявіла:

— Раней беларуская жанчына была двойчы бяспраўнай: па-першае таму, што была беларускай, па-другое, што жанчына. Цяпер не тое. Кожная працоўная жанчына ў СССР, да якой-бы нацыянальнасці не належала, карыстаецца аднолькавымі правамі з мужчынамі, роўнапраўна з працоўнымі ўсіх нацыянальнасцей.

У раёне ўжо сабрана больш 100 прапаноў і далаткаў да праекта новай Канстытуцыі БССР.

Быстра ліквідуем вынікі шкодніцтва

5 лютага рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі менскага паравознага дэпо абмяркоўвалі зварот чыгуначнікаў маскоўскага і тульскага вузлоў чыгункі імя Ф. Э. Дзержынскага, апублікаванага ў «Правде» за 4 лютага 1937 года пад назвай «Быстра ліквідуем вынікі шкодніцтва». Паравознікі менскага дэпо абавязаліся стаханаўскай работай забяспечыць узлым транспарту, павысіць сваю рэвалюцыйную пільнасць на ўсіх участках.

У гэты-ж дзень рабочы дэпо тав. Ерахавец і майстар тав. Шарпіё выкрылі ліцейшчыка Сонькоўскага, які займаўся крадзежам каляровых металаў.

Прыклад пільнасці паказаў машыніст паравоза СУ-200-94 тав. Баранчык. У часе стаянкі паравоза на шляхах на яго быў пушчан састаў. Пагражала крушэннем. Машыніст Баранчык своечасова заўважыў пагрозу і паспеў убраць свой паравоз.

Н. ГАСМАН.

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ КІРАЎНІЦТВА СПРАВАЙ ВЫНАХОДНІЦТВА

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

У адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 22 ліпеня 1936 г. «Аб рэарганізацыі кіраўніцтва справай вынаходніцтва» (З. З. СССР 1936 г., № 39, арт. 334). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Ліквідаваць Камітэт па вынаходніцтву пры Эканамічным Совеце БССР.

2. Усклясці на народныя камісарыяты БССР адказнасць за становішча ўчоту, распрацоўкі і ўнядрэння вынаходніцтваў і тэхнічных удасканаленняў у падпарадкаваных ім галінах народнай гаспадаркі.

3. Прапанаваць народным камісарыятам БССР узмацніць кантроль за рэалізацыяй вынаходніцтваў кіраўніцтвамі, трэстамі і прадпрыемствамі.

4. Скасаваць арт. 7 пастановы СНК БССР ад 5 лістапада 1932 г. «Аб становішчы вынаходніцтва і рэалізацыі рабочых прапаноў» (З. З. БССР № 67, паст. 334) і пастанову Эканамічнага Совета БССР за 25 красавіка 1935 г. «Аб зацвярджэнні складу камітэта па вынаходніцтву пры Эканамічным Совеце БССР» (З. З. БССР 1935 г. № 24, паст. 132).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

5 лютага 1937 г.
г. Менск.

БАРАЦЬБА З ТРАЦКІСТАМІ У ІСПАНІІ

МАДРЫД, 7 лютага. (БЕЛТА). Падпыўная, зрадніцкая дзейнасць «ПОУМ» (арганізацыя іспанскіх трацкістаў) пабудзіла рэспубліканскія ўлады ў сталіцы прыняць меры супроць гэтай агентуры іспанскага і міжнароднага фашызма. Загадам камітэта абароны Мадрыда наложан арышт на радыёстанцыю «ПОУМ», праз якую, як гаворыцца ў загадзе, трацкісты «сістэматычна нападалі на законны ўрад рэспублікі, на народны фронт і яго дастойных прадстаўнікоў, на былатных дзеячоў абароны нашага непераможнага горада, а таксама на антыфашысцкія арганізацыі і іх кіраўнікоў». Тымжа загадам наложана забарона і на брудны трацкісцкі лісток «Эль комбатыенте рохо». Друкарня гэтага лістка апячатана «за невыкананне правіл пенсуры і за кампаніі супроць арганізацый народнага фронта і законных улад рэспублікі».

Мерапрыемствы гэтыя будуць, несумненна, з задавальненнем сустрэты антыфашысцкімі масамі ў Іспаніі, як першыя крокі на шляху да разгрому агрэсіі трацкісцкіх здраднікаў, якія нястомна дапамагаюць іспанскім, германскім і італьянскім фашыстам у іх спробах ператварыць Іспанію ў калонію і ў ваенны плацдарм замежнага фашызма.

Орган партыі «Франтэ рохо» патрабуе афіцыяльнага роспуску «ПОУМ». У рэдакцыйным артыкуле гаворыцца: «Справа ідзе аб бандытах, якіх фашызм пакінуў у нашым асяроддзі... Мы патрабуем, каб народны трыбунал пасадзіў на лаву падсудных фашысцкія кадры гэтай арганізацыі».

ФРАНЦУЗСКІ ДРУК АБ ПРАМОВЕ ГЕБЕЛЬСА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 7 лютага. (БЕЛТА). Французскія газеты каментуюць апошнюю прамову гэрманскага міністра прапаганды Гебельса, з якой ён выступіў у Гамбургу. Прамова змяшчае звычайны антысовецкі брэд і чарговыя выпады супроць іншых дзяржаў.

Радыкал-сацыялістычная газета «Эр нувэль» піша, што выступленне Гебельса, як відаць, не мела іншай задачы, апрача аднаўлення і ўзмацнення кампаніі супроць Совецкага Саюза. Паводле слоў газеты, Гебельс адзначыў неміну часць канфлікта паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. Аднак, — заяўляе далей газета, — антысовецкая кампанія гітлераўскай Германіі не ўвядзе ў заблужэнне еўрапейскія краіны. «Сапраўдную небяспеку, — піша газета, — усё больш прадстаўляе сабою палітыка Германіі: Еўропа гэта вельмі добра ўсведамляе, каб закрываць на гэта вочы. Францыя бачыць гэту пагрозу з усёй яснасцю. Заключаючы пакт з Совецкім Саюзам, Францыя ведала, што яна яднае свае намаганні з намаганнямі краіны, якая паспяхова працуе над арганізацыяй калектыўнай бяспечнасці».

З артыкулам, вытрыманым у тоне злой іроніі, адклікаецца на прамову Гебельса умярана-правая газета «Энтрансіжан». Газета піша, што Гебельс зрабіў нямала нелаўгорных прызнанняў. Гебельс заявіў аб немінучасці канфлікта паміж Совецкім Саюзам і Германіяй і распісваў клопаты Германіі аб недапушчэнні «пашырэння большэвіцкай заразы». Але якім чынам Гебельс уяўляе сабе аперацыю недапушчэння большэвіцкай эпідэміі? — гаворыць далей газета. — У адказ на гэта пытанне мы чуем толькі слабы скрытыя пагрозы. Перш за ўсё Чэхаславакія праставляе сабой вялікую небяспеку ў сілу свайго пагаднення з Совецкім Саюзам. Вось вам першы вораг, якога трэба пабіць. Другі вораг—Францыя. «Нам вельмі добра вядома, — сказаў Гебельс, — што Іспанія патрэбна большэвікам для прыжка на Францыю, адкуль яны будуць пагражаць Германіі». «Такім чынам, мы папярэджаны, — піша газета. — У адну прыгожую раніцу, пад выглядам «абароны еўрапейскай цывілізацыі» і свяшчэннай Германіі, якая з'яўляецца ле ашлотам, райхсвер накінецца на Чэхаславакію і на нас. Гэта не будзе «напад», але будзе толькі зусім «законная» абарона. Так прабуюць пераканаць германскі народ... Справа толькі ў тым, што мы моцны і аб'яднаны, і ўказанае прадпрыемства не будзе вельмі лёгкім. Немцы гэта ведаюць...».

ГРАНДЫЁЗНАЯ АНТЫФАШЫСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 7 лютага. (БЕЛТА). Комуністычнай і сацыялістычнай партыямі пры падтрымцы антыфашысцкіх арганізацый, якія ўваходзяць у народны фронт, арганізавана сёння ў Парыжы на плошчы Рэспублікі масавае шэсце ў памяць працоўных Парыжа, загінуўшых у лютым 1934 года ў барацьбе супроць спробы фашысцкага мяцежу. Не гледзячы на вельмі неспрыяльныя ўмовы надвор'я, шэсце выліўся ў грандыёзную антыфашысцкую дэманстрацыю — сведчанне магутнасці народнага фронт барацьбы супроць фашызма.

У шэсці прынялі ўдзел многія дзесяткі тысяч рабочых, служачых і інтэлігенцыі Парыжа. Безупынна грымеў «Інтэрнацыянал», раздаваліся антыфашысцкія лозунгі.

Скончэнне забастоўкі маракоў ціхаакіянскага ўзбярэжжа ў ЗША

НЬЮ-ЮРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 5 лютага. (БЕЛТА). Закончылася забастоўка 40 тыс. маракоў ціхаакіянскага ўзбярэжжа. Бастуючыя фактычна дабіліся задавальнення ўсіх сваіх патрабаванняў. Усе профсаюзы, за выключэннем профсаюза параходных служачых і механікаў, дабіліся павелічэння зарплаты і права кантраляваць наём і звальненне рабочых.

Прыезд у Маскву фінляндскага міністра замежных спраў

8 лютага ў Маскву прыбыў міністр замежных спраў Фінляндыі п. Холсці з супругай.

На Ленінградскім вакзале іх сустрэлі: намеснік народнага камісара замежных спраў тав. Н. Н. Крэстінскі, намеснік старшыні Моссовета тав. Б. А. Штэрнберг, намеснік камандуючага войскамі Маскоўскай ваеннай акругі камкор тав. Б. С. Гарбачоў, загадчык першага заходняга аддзела НКЗС тав. М. А. Карскі, загадчык пратакольнага аддзела НКЗС тав. В. Н. Баркоў, камендант горада Масквы камдзіў тав. М. Ф. Лукін, пам. заг. першага заходняга аддзела НКЗС тав. А. В. Фехнер і ўвесь склад фінляндскай місіі ў Маскве.

Разам з міністрам прыбылі: фінляндскі пасланнік ў Маскве п. Ір'е-Коскінен, паўпрэд СССР у Фінляндыі тав. Э. А. Асмус і дырэктар дэпартамента фінляндскага міністэрства замежных спраў п. Паюла з жонкай. (БЕЛТА).

Салідарнасць працоўных ЗША з іспанскім народам. НА ЗДЫМКУ: члены амерыканскага санітарнага атрада, які адпраўляецца ў рэспубліканскую Іспанію, у дзень ад'езду 16 студзеня г. г. у нью-йоркскай гавані. (СФ).

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

ЯРАСНЫЯ АТАКІ МЯЦЕЖНІКАЎ НА ПОЎДЗЕНЬ АД МАДРЫДА

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 7 лютага. (БЕЛТА). Камітэт абароны Мадрыда апублікаваў сёння ў поўдзень наступнае паведамленне:

«Наступленне, разгорнутае мяцежнікамі з учарашняга дня на паўднёвых участках мадрыдскага фронта, носіць асабліва ярасны характар і падтрымліваецца моцнымі матарызаванымі часцямі. Урадавыя войскі аказалі і аказваюць мяцежнікам рашучы адпор па ўсёй лініі.

Мяцежнікі панеслі цяжкія страты. Некаторае прасоўванне, якое ім удалося ажыццявіць пасля шматгадзінных баёў, не мае вялікага значэння з пункту гледжання агульнай сістэмы абароны сталіцы.

Сёння раніцаю ў тых-жа пунктах, дзе і ўчора, мелі месца новыя баі. Аднак, дзённае надвор'е значна перашкаджае аперацыям».

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 7 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Мадрыда, што ўрадавыя войскі на карлоўскім фронце занялі вёскі Ільера, Калатрава і Сант'яго дэ Калатрава на поўдзень ад Поркуна. Рэспубліканская калона заняла таксама вёскі Адамус і Клавельіна ў правінцыі Кардова.

***

ПАРЫЖ, 7 лютага. (БЕЛТА). Крэйсеры мяцежнікаў «Канарыяс» і «Альмірантэ сервера» працаўжаюць бамбардыроўку прыбярэжнай дарогі каля Малагі. Зранку судны мяцежнікаў адкрылі інтэнсіўны агонь па берагу ў раёне Мотрыль (на ўсход ад Малагі) і папсавалі дарогу. Жорсткія баі адбываюцца ў раёне Вентасдэ Сафарайя (на паўночны ўсход ад Малагі).

Рэспубліканскія дружыннікі, якія змагаюцца на гэтым фронце, аказваюць ярае супраціўленне мяцежнікам. Урадавыя войскі па-ранейшаму астаюцца гаспадарамі становішча ў раёне Сіера дэ Міхас (горны раён паміж Марбельяй і Малагай).

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 7 лютага. (БЕЛТА). Урадавыя войскі атакуюць Лопера (на ўсход ад Кардовы). У раёне Вілья-даль Рыо (на паўночны захад ад Лоперы) урадавыя войскі знаходзяцца за 50 метраў ад горада. У раёне Монтора (на паўночны ўсход ад Кардовы) ідзе жорсткая барацьба за мост праз раку Гвадалквівір.

У раёне Пасабланка ўрадавыя войскі прасоўваюцца праз горы, не сустракаючы супраціўлення. Яны занялі стратэгічныя пазіцыі і абстрэльваюць мост Алколеа на рацэ Гвадалквівір за 15 кілометраў ад Кардовы.

ПАЎСТАННЕ СЯРОД МАРАКАНСКІХ ЧАСЦЕЙ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 7 лютага. (БЕЛТА). На фронце Эскарыяла (на паўночны захад ад Мадрыда) сярод маракан скіх войск успыхнула паўстанне ў сувязі з нявыплатай жалавання. Паўстанне было падаўлена войскамі мяцежнікаў, прыбыўшымі з Бургоса.

Шмат удзельнікаў паўстання расстрэлена.

Арышты комуністаў у Чэхаславакіі

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 6 лютага. (БЕЛТА). Чэхаславацкія газеты паведамляюць аб вобысках і арыштах чэхаславацкіх комуністаў і асоб, падазраваемых у вярбоўцы добраахвотнікаў для іспанскай рэспубліканскай арміі. Цэнтральны орган партыі чэшскіх сацыялістаў «Чэске слова» паведамляе, што ў Главе (Заходняя Маравія) паліцыя зрабіла 4 лютага вобыскі ў раду кіраўнікоў мясцовай комуністычнай арганізацыі, учыніла допыты многім асобам і арыштавала двух комуністаў-актывістаў. У той-жа час паліцыя забараніла сходы членаў профсаюзаў, скліканыя мясцовай комуністычнай арганізацыяй.

СКОНЧЫЛАСЯ БАБРУЙСКАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Два дні засядала чацвертая бабруйская раённая партыйная канферэнцыя. 258 дэлегатаў удзельнічала ў рабоце канферэнцыі. 42 дэлегаты выступілі ў спрачках па дакладу райкома.

Партыйная канферэнцыя ў Бабруйску многаму вучыць. Урокі яе неабходна ўлічыць арганізацыям, у якіх у бліжэйшы час будуць праведзены партыйныя канферэнцыі.

Тав. Чэрнышоў быў самакрытычным. Ён многа гаварыў аб недахопах. Але астатнія яго не падтрымалі. Дэлегаты больш усяго гаварылі аб поспехах у рабоце. Іх прамовы прыкладна пачыналіся так:

— Пад кіраўніцтвам сакратара райкома партыі тав. Чэрнышова наша партыйная арганізацыя большэвізавана.

— Наша бабруйская прамысловасць—калыска стаханаўскага руху ў Беларусі.

— Пад кіраўніцтвам тав. Чэрнышова мы дабіліся вялікіх поспехаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Ці патрэбна гэта партыйнаму работніку? Хіба не ясна, што гэтыя пахвалы трэба было неадкладна спыніць? Між тым ні тав. Чэрнышоў, ні хто іншы не знайшлі часу раскрытыкаваць падхалімаў і арганізаваць спрачкі, накіраваўшы іх у русло здаровай самакрытыкі недахопаў партыйнай работы ў раёне.

ЦК ВКП(б) вучыць нас правільнай арганізацыі партыйнай работы, папярэджвае супроць небольшэвіцкіх метадаў работы, якія маюць месца ў радзе партыйных арганізацый. Факты, якія мелі месца ў Растове і Кіеве, — дзяцінкае захапленне гаспадарчымі пытаннямі, перадавер'е партыйнай работы другарадным людзям іспуюць і ў Беларусі. Элементы небольшэвіцкіх метадаў работы ёсць і ў Бабруйскай арганізацыі. Райком у радзе выпадкаў падмяняе совецкія органы, а пярвічныя партыйныя арганізацыі падмяняюць гаспадарнікаў. Гэтыя нездаровыя з'явішчы знайшлі сваё адлюстраванне і ў спрачках на канферэнцыі. Выступаючыя дэлегаты больш усяго гаварылі аб гаспадарчых задачах, аб гаспадарчых выніках. Слухаючы іншага прамоўцу, цяжка было зразумець, дзе ён знаходзіцца — на партыйнай канферэнцыі, ці на вытворчай нарадзе. Не выправіў становішча спраў і другі сакратар райкома т. Хацкевіч, які выступаў у спрачках.

Аб пастаноўцы партыйнай работы ў пярвічных арганізацыях і недахопах яе, аб баявых пытаннях унутрыпартыйнай работы на канферэнцыі гаварылася вельмі мала. А трэба было-б гаварыць галоўным чынам аб гэтым, бо закон партыйнага жыцця—статут партыі ў Бабруйскай арганізацыі парушаўся не толькі ў пярвічных арганізацыях, але і самім райкомам.

У складзе пленума райкома з 28 членаў райкома, абраных трэцяй партыйнай канферэнцыяй, асталося ўсяго 6 чалавек, тады як астатнія былі кааптаванымі. У многіх пярвічных партыйных арганізацыях тэрміны паўнамоцтва абраных органаў даўно прайшлі, але яны не пераабіраліся. У партарганізацыях Белпрамгандля, сула і інш. парушаўся статут партыі. Гэтыя факты, вядома, павінны былі-б прыцягнуць увагу партыйнай канферэнцыі ў першую чаргу.

З велізарнай любоўю гаварылі дэлегаты аб таварышу Сталіне і Цэнтральным Камітэце Усесаюзнай Комуністычнай Партыі. З гневам і нянавісцю гаварылі яны аб лютых ворагах народу Пятакове, Радэку, Серобракову, Сакольнікаву і інш. з шайкі Іудушкі-Троцкага. Аднак, амаль не гаварылі аб ворагах, якія дзейнічалі і дзейнічаюць у Бабруйску. Між тым у задачу партыйнай канферэнцыі ўваходзіла ўзняць рэволюцыйную пільнасць членаў арганізацыі, прыцягнуць іх увагу да барацьбы, якую вядзе вораг на тэрыторыі Бабруйскага раёна ў першую чаргу. Факт-жа, што пасля праверкі партыйных дакументаў, у час абмену партыйных дакументаў былі выпадкі, калі ворагі ў Бабруйскай арганізацыі атрымлівалі партыйныя білеты. Ужо пасля абмену партыйных дакументаў райком выключыў з партыі людзей чужых і ворагаў у колькасці 34 чалавек. Хіба не варта было прыцягнуць увагу партыйнай арганізацыі да гэтага факта? Хіба, нарэшце, не варта было партыйную арганізацыю мабілізаваць на выкрыццё яшчэ нявыкрытых ворагаў? Хіба не варта было прыцягнуць увагу членаў партыі да тых участкаў палітычнай і гаспадарчай работы, дзе яўна адчуваецца рука не выкрытага яшчэ ворага?

ЦК ВКП(б) і таварыш Сталін вучаць нас, што галоўнае ў падборы і праверцы людзей, у іх вывучэнні. На бабруйскай канферэнцыі меў месца факт, які сведчыць аб невыкананні гэтага ўказання кіраўніком Бабруйскай арганізацыі тав. Чэрнышовым.

Па прапанове тав. Чэрнышова ў спіс кандыдатаў у члены новага райкома быў уключан нейкі Балдзенка. Яму тав. Чэрнышоў даў на канферэнцыі добрую характарыстыку. Затым Балдзенка расказаў сваю аўтабіяграфію, з якой выясніліся факты, невядомыя райкому аб тым, што Балдзенка быў дэзертырам Чырвонай Арміі. Натуральна, што канферэнцыя не абрала Балдзенку ў члены райкома. Факт гэты таксама паказальны і заслугоўвае таго, каб канферэнцыя пагаварыла аб вывучэнні людзей райкомам.

Канферэнцыя закончыла сваю работу. Абран новы райком. Новы райком павінен у практычнай рабоце выправіць недахопы спрачак, якія разгарнуліся па дакладу райкома на партыйнай канферэнцыі.

Г. ВЯРХОЎСКІ.

КАНСТАТУЮЦЬ ФАКТЫ ПАРУШЭННЯ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

БЫХАЎ. (Ад нашага спец. карэспандэнта). У апошніх лічбах снежня 1936 года старшыня Ніканавіцкага сельсовета Андрэюк груба парушыў 127 артыкул Сталінскай Канстытуцыі, дзе запісана: «Грамадзянам СССР забяспечваецца недатыкальнасць асобы. Ніхто не можа быць падвергнут арышту інакш, як па пастанове суда ці з санкцыі пракурора». Андрэюк самачынна арыштаваў калгасніц Саханёнак А., Цярэшчанка Г., Цярэшчанка В. і Арцёменка Л. за невыкананне загавору і пратрымаў іх пад вартай амаль увесь дзень. Выключныя бясчынствы правяў Андрэюк да калгасніцы Арцёменкі, якую не дапусціў нават пакарміць грудное дзіця.

Здавалася-б, што такое недапушчальнае самавольства і разбэшчанасць старшыні сельсовета Андрэюка павінна было сустрэць самы рашучы адпор з боку раённых арганізацый. Але не на гэта здольны быхаўскія кіраўнікі. Райком партыі ў прынятым рашэнні па справе Андрэюка прызнае, што ён «правяў яўнае парушэнне рэволюцыйнай законнасці», лічыць «паводзіны Андрэюка недастойнымі члена партыі» і за гэта абвяшчае яму «вымову з занясеннем ва ўчотную картку». Адначасова бюро РК прапанавала пракурору тав. Левінай тэрмінова правесці следства аб незаконных дзеяннях старшыні Ніканавіцкага сельсовета т. Андрэюка і прыцягнуць яго да судовай адказнасці».

І вось прайшло больш месяца з дня апублікавання ў райгазеце рашэння бюро РК КП(б)Б, а Андрэюк ні да якой судовай адказнасці не прыцягнут, па-ранейшаму працуе старшынёй сельсовета. Райпракурор Левіна «смиренно ждет» указаняў зверху і нават не думае прыцягваць Андрэюка да адказнасці.

Трэба напомніць, што Андрэюк яшчэ ў 1935 годзе судзіўся за скрыўленне рэволюцыйнай законнасці ў сельсавеце і быў прыгаворан да некалькіх месяцаў прымусовых работ.

І зусім невыпадкова, што праз якіх-небудзь 5 дзён у раёне мае месца другое грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі. 9 студзеня склікалася праўленне калгаса імя Кірава, Студзёнкаўскага сельсовета. На пасяджэнні, апрача членаў праўлення, прысутнічалі жанчыны, але старшыні калгаса Сухадольскаму гэта не спадабалася. Ён, замест прыцягнення жанчын да актыўнага ўдзелу ў вырашэнні пытанняў калектыўнай гаспадаркі, абвясціў ім: «пасяджэнне будзе зачыненым, прашу жанчын пакінуць памяшканне, абыйдземся без вас». Прычым ён іранічна дадаў, што «я гэта раблю згодна новай Канстытуцыі»(!?)...

Як і ў першым выпадку, быхаўскія раённыя арганізацыі ў гэтым выступленні таксама нічога «асаблівага» не заўважылі. Уся справа скончылася тым, што ў райгазеце толькі 17 студзеня надрукавана на 4 старонцы маленькая заметка «Скажэнне Канстытуцыі», якая зноў канстатуе факт і ніякіх вываў не робіць. Ні райком партыі, ні райвыкайком не зацікавіліся гэтым фактам.

Ва ўсім гэтым здзіўляе благадушша і палітычная блізарукасць быхаўскага РК КП(б)Б да парушальнікаў гістарычнага дакумента — Сталінскай Канстытуцыі.

П. КАВАЛЁЎ.

В. К. КІН

Кіраўнік Усебеларускай канторы Сельгасбанка

РАСЦЕ ДЗЯРЖАЎНАЯ КРЭДЫТНАЯ ДАПАМОГА КАЛГАСАМ

Соўнарком Саюза ССР зацвердзіў план доўгатэрміновага вытворчага крэдытавання калгасаў і калгаснікаў па БССР на 1937 год у суме 32,5 млн. рублёў.

Водпуск дзяржавай такой велізарнай сумы для аказання крэдытнай дапамогі калгасам і калгаснікам ярка адлюстроўвае сталінскія клопаты аб далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і росце заможнасці калгаснікаў.

Аб росце гэтай дапамогі красамоўна гаворыць наступныя лічбы. У 1934 годзе калгасам было выдана 6.205 тыс. рублёў крэдыта, у 1935 годзе—11.606 тыс. руб., у 1936 г.—23.583 тыс. руб., у 1937 г. вызначана 32.500 тыс. рублёў, што ў процантах да 1934 года дае рост на 523,7 проц.

Крэдыт адыграў выключна вялікую ролю ў справе забеспячэння калгасам выканання вытворчых паказальнікаў, устаноўленых для іх урадам. Асноўная ўвага пры выкананні крэдытнага плана 1936 годзе сістэмай Сельгасбанка, у поўнай адпаведнасці з указаннем урада, была накіравана на крэдытаванне мерапрыемстваў, забяспечваючых выкананне дзяржаўнага плана развіцця жывёлагадоўлі, асабліва яго яласных паказальнікаў, павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў, развіццё тэхнічных культур і механізацыя іх пярвічнай апрацоўкі, завяршэнне ліквідацыі бескароўнасці сярод калгаснікаў.

Апрача гэтага ў 1936 годзе ў парадку крэдытнай дапамогі дзяржавай праз Сельгасбанк, адпушчаны значныя сумы на электрыфікацыю калгасаў, будаўніцтва падсобных прадпрыемстваў калгасаў — зернасушылкі, пагельныя і чарапічныя заводы млыны і т. д.

З дапамогай крэдыта калгасы нашай рэспублікі ў 1936 годзе закупілі племянной жывёлы, буйнай рагатай—6154 галоў, свіней — 11.400 галоў, племянных баранаў — 14.800 галоў. Усяго на суму 13.300 тысяч руб. Крэдыта на гэту мэту было выдана 7.265 тыс. руб., што складае 54,6 проц. кошту набытай калгасамі племянной жывёлы. З дапамогай крэдыта калгасы набылі 13.300 пчоласем'яў. Пры дапамозе крэдыта з 1934 г. 111 тыс. калгасных двароў ліквідавалі сваю бескароўнасць.

З дапамогай крэдыта калгасы пабудавалі ў 1936 годзе 6 гідраэлектрастанцый, 203 пагельныя заводы і 5 чарапічных. З агульнага кошту купленых калгасамі машын па пярвічнай апрацоўцы ільну—2,1 млн. руб.—крэдыт складае 1,8 млн. руб.

У барацьбе за высокі ўраджай і выкананне сталінскай праграмы вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў зярна крэдыт шырока скарыстоўваецца на набыццё мінеральных угнаенняў, правядзенне землеўпарадчых работ і т. д.

У дадатак да крэдыта калгасы штогодна ўкладваюць на пашырэнне сваіх асноўных сродкаў (жывёлы, машын, пабудоў і інш.) капітальныя затраты са сродкаў непадзельных фондаў. Аб гэтым ярка сведчаць паступленні і выдаткаванні гэтых сродкаў праз рахункі непадзельных фондаў калгасаў у Сельскагаспадарчым банк.

Так, у 1934 годзе выдаткавана сродкаў непадзельных фондаў праз Сельскагаспадарчы банк 1,9 млн. рублёў, у 1935 годзе — 16,3 мільёна рублёў і ў 1936 годзе — 38,7 мільёна рублёў.

Значна выраслі і астаткі сродкаў грашовых непадзельных фондаў у Сельскагаспадарчым банку. Так, на 1 студзеня 1935 года яны складалі 2,9 мільёна рублёў, на 1 студзеня 1936 года — 5,3 мільёна рублёў і на 1 студзеня 1937 года — 8,1 мільёна руб.

Асноўны напрамак крэдыта ў 1937 годзе выцякае з тых агульных задач, якія стаяць перад калгасамі, выражаных у даводзімых да іх дзяржаўных планах. Усе звенні сістэмы Сельгасбанка павінны пры крэдытаванні калгасаў у 1937 годзе асаблівую ўвагу сканцентраваць на крэдытаванні мерапрыемстваў, забяспечваючых рост прадукцыйнасці калгаснай жывёлагадоўлі (купля племянной жывёлы, будаўніцтва жывёлагадоўчых будынкаў, паляпшэнне лугоў і пасьбішчаў, развіццё каняводства і т. д.); павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў і правядзенне мерапрыемстваў па барацьбе з засухай (насенаводства, пакупка ўгнаенняў і т. д.); пашырэнне падсобных прадпрыемстваў па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў з мясновай сыравіны і прадпрыемстваў па пераапрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў.

Па асобных мерапрыемствах сумы доўгатэрміновага вытворчага крэдыта для калгасаў на 1937 год Саюзным урадам зацверджана: на куплю племянной жывёлы—5,5 млн. рублёў, на куплю племянных баранаў — 0,7 млн. руб., кантрактацыю цёлак МТФ—1,8 млн. руб., будаўніцтва жывёлагадоўчых пабудоў — 4,0 млн. руб., паляпшэнне лугоў і пасьбішчаў—1,3 млн. руб., на куплю рабочай жывёлы — 1,2 млн. руб. і т. д. Усяго па мерапрыемствы па жывёлагадоўлі — 16,6 млн. руб., на ільнаводства—3,4 млн. руб., на насенаводства і куплю шматгадовых траў — 3,0 млн. руб., на куплю мінеральных угнаенняў—3,0 млн. руб. Калгаснікам на куплю цёлак—1,0 млн. руб і па рад іншых мерапрыемстваў.

Дзяржаўны крэдыт калгасам адыгрывае немалаважную ролю ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. 7,5 млн. руб. павінны быць выкарыстаны на мерапрыемствы, звязаныя з сяўбой. Крэдыты па насенаводства, мінеральныя ўгнаенні і рабочую жывёлу амаль поўнасцю рэалізуюцца вясной. Работнікі банка павінны аддаць зараз асаблівую увагу крэдытам, якія ідуць на мерапрыемствы, звязаныя з сяўбой, забяспечыць іх поўнае выкарыстанне.

Галоўная задача зараз заключаецца ў тым, каб гэту мільённую крэдытную дапамогу, аказаную дзяржавай калгасам БССР, сумесна з іх недзялімым фондам выкарыстаць з максімальнай эфектыўнасцю. Адказнасць за гэту справу нясуць, перш за ўсё, сістэма Сельгасбанка і органы Наркамзема.

Рашэннем СНК СССР ад 22 кастрычніка 1935 года планаванне сельскагаспадарчага крэдыта ўскладзена на Сельскагаспадарчы банк. Перад Сельскагаспадарчым банкам стаіць важнейшая задача—скласці план крэдытавання ў разрэзе раёнаў і калгасаў. Поспех гэтай работы залежыць у значнай ступені ад своечасовага атрымання ад зямельных органаў вытворчых паказальнікаў, іх дакладнай прапрацоўкі, а таксама атрымання заявак ад калгасаў на крэдыты 1937 года, у адпаведнасці з зацверджаным вытворчым планам і прыходна-расходным капітарысам.

Трэба сказаць, што ў справе планавання крэдыта за апошні год банк значна палепшыў сваю работу. Аднак, не ўсюды яшчэ забяспечана дакладная праверка гаспадарчага і фінансавага становішча кожнага асобнага калгаса, каб на падставе гэтай праверкі вызначыць размер сапраўды патрэбнага крэдыта для данага калгаса. Няма яшчэ неабходных клопатаў аб эфектыўным выкарыстоўванні калгасамі адпускаемага ім крэдыта.

Раённыя выканаўчыя камітэты ў бліжэйшы час павінны будуць разгледзець па прадстаўленню банкаў з заключэннем райза гадавыя планы крэдытавання калгасаў. Важна, каб цяпер ужо райвыканкомы ўзялі пад сваё кіраўніцтва работу па складанню планаў. Важна, каб усе калгасы пры складанні сваіх вытворчых планаў і прыходна-расходных капітарысаў поўнасцю ўлічылі і ўнеслі ў кашта рысы ўсе вытворчыя заданні, на якія будзе выдавацца крэдыт.

Соўнарком СССР у сваёй пастанове ад 15 студзеня 1937 года «Аб крэдытным плане Сельгасбанка на 1937 год» запісаў: «прапанаваць Сельгасбанку крэдытаванне будаўніцтва вытворчых пабудоў у калгасах паставіць у залежнасць ад наяўнасці пастановы агульнага схода аб будаўніцтве крэдытуемых аб'ектаў і наяўнасці тэхнічнага нагляду за будаўніцтвам, кантралюючы ў працэсе крэдытавання скончанне будаўніцтва ў вызначаныя тэрміны».

Гэтым рашэннем урад даручыў Сельгасбанку спрыяць скарачэнню перахадзячага будаўніцтва, якое наглядаецца ў велізарных размерах у калгасах і прыносіць вялікія страты для калгасаў з-за пясоечасовага скончання пачатых пабудоў.

Поўнае асваенне крэдытнага плана будзе залежаць у значнай меры ад своечасовага і поўнага звароту калгасамі тэрміновых плацяжоў Сельгасбанку. Соўнарком СССР у пастанове ад 29 лютага 1936 года, улічваючы поспехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, патрабаваў рашуча ўзмацніць фінансава-крэдытную дысцыпліну ў доўгатэрміновым вытворчым крэдытаванні калгасаў.

У гэтай пастанове Соўнаркома СССР запісана: «не дапускаць выдачы пазык калгасам, якія маюць пратэрмінаваную запазычанасць перад Сельгасбанкам».

Не гледзячы на велізарную дапамогу, аказаную калгасам у мінулым годзе (спісанне з калгасаў БССР 22 млн. руб. запазычанасці па старых пазыках), пратэрміноўкі калгасаў Сельгасбанку ўсё яшчэ маюць месца. На 1 студзеня 1937 года за калгасамі нашай рэспублікі лічыцца 423 тыс. руб. пратэрміновак і, апрача гэтага, 157 тыс. руб. па авансах, выданых для ліквідацыі бескароўнасці сярод калгаснікаў.

Зусім нецярпіма, калі па асобных раёнах пратэрміноўкі за калгасамі на 1 студзеня 1937 года складаюць: па Клімавіцкаму раёну — 40 тыс. руб., па Нараўлянскаму — 24 тыс. руб., па Лоеўскаму—28 тыс. руб., Мсціслаўскаму — 66 тыс. руб., па Расонскаму — 30 тыс. руб., па Дамжанавіцкаму раёну — 24 тыс. руб. і т. д.

Сельгасбанк і зямельныя органы абавязаны забяспечыць укараненне і правядзенне цвёрдай крэдытнай дысцыпліны, непахісныя прынцыпы совецкага крэдыта — мэтавае накіраванне крэдыта, тэрміновасць і зваротнасць.

Задача заключаецца ў тым, каб усю работу Сельгасбанка пранізаць сапраўды сацыялістычнымі метадамі работы. Шырока растлумачыць калгасам парадак выдачы крэдыта і тую велізарнейшую дапамогу, якая аказваецца ім совецкай дзяржавай. Правільнай арганізацыяй крэдытнай работы, укараненнем крэдытнай дысцыпліны трэба дабіцца максімальнага эфекта ад крэдыта ў справе выканання велізарнейшых задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад ордэнаноснай БССР у 1937 годзе.

ДА СТАГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ А. С. ПУШКІНА

А. С. ПУШКІН

ПАЛТАВА

ПРЫСВЯЧЭННЕ

Табе—ды голас музы цёмнай
Ні закране твой чуткі слых?
Ці ўловіш ты душою скромнай
Палёт сардэчных дум маіх?
Ці прысвячэнне ад паэта,
Як і калісь яго любоў,
Пакінеш зноў ты без прывету
І не прызнаеш яго слоў?
Пазнай-жа хоць былыя гукі —
Калісь была ты рада ім
І думай, што і ў дні разлукі
У лёсе зменлівым маім
Твая сумотная пустыня,
Апошні гук тваіх размоў —
Адзін мой скарб, адна святыня,
Мае душы адна любоў.

ПЕСНЯ ПЕРШАЯ

Багаты, слынны Качубей.
Яго луті — разгон прастору.
Там табуны яго каней
Пасуцца вольна, без прызору.
Вакол Палтавы хутары
Яго атулены садамі.
Жыве ў раскошы і ў дабры,
І п'е і есць на серабры,
І шмат багацця пад замкамі.
Ды Качубей багат і горд
Не доўгагрывымі канямі,
Нэ золатам, данінай орд,
І не фамільнымі дварамі.
А ганарыцца Качубей
Красуній дочкаю сваёй.
І сапраўды: ў Палтаве — не,
Няма красы, Марыі роўнай:
Яна свяжа, як на вясне
Прывабны цвет цішы дуброўнай.
Як тополь кіеўскіх вышынь,
Яна страйна. Яе парывы
Нагадваюць то рачкі плынь,
То лебедзі ход між глыбінь,
То быстрай лані бег імклівы,
Як пена, персь яе была.
Вакол высокага чала
Як хмары локаны чарнеюць,
З яе вачэй зоры глядзяць,
Як ружа вусны яе рдзеюць.
Ды не адна красы пячаць —
Імгненны цвет! — пагудкай шумнай
У ёй прызнана, ўхваляна:
Усюды славіцца яна
Дзяўчынай скромнай і разумнай.
Затоя знатных жаніхоў
Шле ёй Украйна і Расія,
Ды ад вянца, як ад акоў,
Бяжыць пужлівая Марыя.
Адмоўны сказ тым жаніхам,
І вось сватоў шле гетман сам.
Стары ён, змучаны гадамі,
Вайною, клопатам, трудамі.
Пачуцці-ж ў ім кіпяць, і зноў
Мазепа ведае любоў.
Імгненна серца маладое
Гарыць і гасне, і мілосць
У серцы тым не новы госць:
Штодня пачуцце ў ім другое.
Не так паслушна, не злягка,
Не так раптоўнасцю запала
Пылае серца старыка,
Што плынь гадоў загартавала.
Упарта, спакваля яно
Праходзіць палкасці гарно,
Ды позні жар яго не стыне,
Хіба з жыццём ужо пакіне.
Не сарна ў потайнае месца
Бяжыць, арла пачуўшы лёт,
Адна стаілася нявеста,
Дрыжыць, чакаючы прыгод.
І, ўся паўнотка абуреннем,
К ёй маці йдзе і, з дрыганненнем
Схаліўшы руку, кажа ёй:
«Дзе стыд яго, старызна хцівы!
Ці можна? Не, пакуль мы жывы,
Не, ён не ўчыніць намер свой!
Павінны быць аховай дружнай
Сваё хрышчэнніцы, а ён —
Вар'ят! на схіле сваіх дзён
Уздумаў стацца яе мужам!»
Марыя дрогнула. Вакол
Ёй свет заслаўся цьмой магільнай.
Пахаладзела і бяссільна
Упала дзеўчына на дол.
Яна апнулася, ды зноўку
Закрыла вочы і ні слоўка
Не кажа. Бацька з маткай ёй
Шукаюць сэрца заспакоіць
І разагнаць ліхі настрой,
Трывогу, смутных думак рой.
Дарма! Цалюткія два дні
Была Марыя, бы ў агні.
І не піла яна, не ела,
Хадзіла плачучы, як цень,
І не сплючы. На трэці дзень
Яе святліца апустела.
Ніхто не знаў, калі і як
Сышла яна. Адзін рыбак
Чуў коней тупат а той ночы,
Казацкі голас і дзявочы
Ды ранкам след васьмі падкоў
Быў відзен на расе лугоў.
Не толькі пух юнацкіх шчок
Ды кучмы русыя, вітыя,
Падчас і старца строгі зрок,
Рубцы і валасы сівыя
У мары палкае красы
Кладуць прыбаву галасы.
І вось да слыху Качубея
Прышла, як з грому навіна:
Забыла гонар, стыд яна, —
Яна ў абдымках ліхадзея!
Ганьба!.. Бацькі... ды як-жа ім
Паверыць гутаркам людскім.
І толькі зараз праўда гэта
Раскрыта ў жудасці сваёй,
І толькі зараз зразумета
Душа бяглянкі маладой,
І толькі зараз стала яўна,
Чаму ўнікала самапраўна
Яна замужства, як акоў,
Тамленнем тайным уздыхала
І ўсё залёты жаніхоў
Маўчаннем гордым сустракала.
Чаму так ціха за сталом
Яна за гетманам сачыла,
Калі бяседа гаманіла,
І чаша пенілась віном;
Чаму яна заўжды спявала
І тыя песні, што ён сам
Складаў, наведамы людзям,
Калі і слынь яго не знала;
Чаму не з дзёўчаю душой
Яна любіла конны строй,
Ваяцкі звон літаўраў, клікі
Прад бунчуком і булавой
Яго, Украіны ўладыкі.
Багаты, знатны Качубей,
Даволі ёсць яго людзей.
Сваю абмыць ён можа славу,
Падняць ён можа ўсю Палтаву;
Раптоўна сроўсь яго харом
Набегчы можа ён, як гром
І помстай бацькі ліхадзею
Ён можа вернаю рукой
Усадзіць... ды намысел не той
Хвалюе сэрца Качубею.
Была то цяжкая пара,
Калі Расія ў змогах сілы,
Яшчэ разгортваючы крылы,
Мужнела з геніем Петра.
Суровы быў у справе славы
Настаўнік дан ёй. Не адзін
Урок пягаданы, крывавы
Задаў ёй шведскі палаадзін.
Але ў іспытах доўгай кары
Акрэпла Русь, знёсшы ўдары.
Так цяжкі молат на свой лад,
Б'ючы шкло ў друз, куе булат.
Вянчаны славаю бясплоднай,
Над багнай Карл ступаў халоднай.
Ён шоў вайною на Маскву
Ды гнаў расійскія дружыны,
Як гоніць віхар пыл даліны
І хіліць кволую траву.
Ён шоў дарогай, дзе ў дні нашы
Больш моцны вораг кінуў след,
Адпіўшы боль а падзення чашы
І загубіўшы славы цвет.
Быў непакой на Украіне.
Пажару іскра ў ёй не стыне.
Сябры крывавай старыны
Народнай прагнулі вайны
І, патрабуючы пыхліва,
Каб гетман волі даў прастор,
Чакаў на Карла нецярпліва
Іх лёгкадумнасці задор.
Вакол Мазепы разліваўся
Мяцежны гул: «Пара! Пара!»
Ды стары гетман аставаўся
Адданым служкаю Петра.
Захоўваючы, як звычайна,
Суровасць, ведаў ён Украіну,
Нібы нічога не зважаў
Ды роўнадушна піраваў.

Пераклаў ЯКУБ КОЛАС.

А. С. ПУШКІН

XXIV

.... Іншоў наведаў я
Буток тае зямлі, дзе я правёў
Выгнаннікам два годы непрыкметных—
Мінула дзесяць год ад тых часоў —
І многа
Змянілася ў жыцці тут для мяне,
Покорны сам, агульнаму закону —
Перамяніўся я — але іншоў
Мінулае мяне ахоплівае жыва,
І быццам толькі ўчора я ходзіў
Па гетым гаю.

Вось апальны домік,
Дзе жыў я з беднай нянюю маёй.
Няма бабулькі ўжо—і за спяною
Не чую я цяжкіх, знаёмых крокаў,
Ні клапатлівага яе дагляду.

Вось лясны ўгорак, над которым часта
Сядзеў я нерухома—і глядзеў
На возера—успамінаючы з журбою
Другія берагі, другія хвалі...
Між залацістых ніў, лугоў зялёных
Яно, сінеючы, разносіцца шырока:
Цераз яго нязведаныя воды
Плыве рыбак і цягне за сабою
Старэнькі невад. Па берегах нястромых
Параскіданы вёскі—там за імі
Скрываўся млын — і ледзьве крылы
Варочае пры ветры — ...

На граніцы
Уладанняў дзедаўскіх, на месцы тым,
Дзе ўгору узнімаецца дарога,
Парытая дажджамі, тры сосны
Стаяць—адна паводаль—дзве другія
Бліжэй адна к другой, — тут калі
іх любач
Я верхам праязджаў пры месяца святле,
Знаёмым шумам шолах іх вяршынь
Мяне вітаў усюды. Той дарогай
Цяпер паехаў я, перад сабою
Убачыў іх іншоў. Яны ўсё тыя-ж,
І той-жа іх, знаёмы вуху шолах —
Але вблізу карэнняў застароўшых
(Дзе некалі было ўсё пуста, гола)
Гай малады цяпер узняўся.
Зялёная сям'я; кусты натоўпам
Пад іх аховаю, як дзеці. А падалёк
Стаіць адзін пахмуры іх таварыш,
Як халасняк стары, вакол яго
Ранейшай пусточ.

Дзень добры, племя
Маладое, незнаёмае. Не я
Убачу ўзрост твой позні і магутны,
Калі перарасцеш маіх знаёмцаў,
І галаву старую іх заслоніш
Ад падарожнага вачэй. Але няхай
мой унук
Пачуе ваш прыветны шум, калі
З таварыскай бяседы ідучы
Вясёлых і прыемных думак поўны
Ён пойдзе побач вас у мораку начы
І пра мяне ўспомніць.

Пераклаў П. БРОЎКА.

А. С. ПУШКІН

МЕДНЫ КОННІК

Пецербургская аповесць

ПРАДМОВА

Здарэнне, апісанае ў гэтай аповесці, мае за асновуісціну. Падробнасці паводкі запазычаны з тагочасных часопісаў. Цікавыя могуць зверыцца з эдамасцю, якую падае В. І. Берх.

УСТУП

На беразе пустынных вод
Стаяў ён, буйных дум палёт
Лунаў у даль. Прад ім шырока
Плыла рака, па ёй — сярод —
Плыў бедны човен адзінока.
Па мшыстых топкіх берагах
Чарнелі хаты ў хмызняках,
Прытул убогага чухонца;
І лес, які не знаў у вяках
Туманам схаванага сонца,
Вакол шумеў.

І думаў ён:

Адсюль грозіць мы будзем шведу,
Тут стане горад з бегам дзён
На зло пышлівому суседу.
Прыродай суджана даўно
У Еўропу высеч тут акно;
Нагою цвёрдай стаць пры моры.
Сюды праз новыя шляхі
Усе ў госці прыплывуць сцягі
І забалюе на прасторы.
І горад после соткі год,
Краін паўночных цуд і дзіва,
З гушчынь лясоў, з дрыгвы балот
Узнёсся пышна, гардаліва.
Дзе ўперад фінскі рыбалоў,
Няшчасны пасынак прыроды,
Адзін ля нізкіх берагоў
Кідаў у нязведаныя воды
Стары свой невад на прасцяк,
Цяпер на цвёрдых берагах
Паўсталі ўместа ўбогіх хатаў
Палацы, вежы. Караблі
Гурбой з усіх канцоў зямлі
Плывуць да прыстаняў багатых.
Граніт адзеў бакі Невы,
Масты навісілі над вадамі,
Цёмназялёнымі садамі
Зазелянелі астравы.
І прад малодшаю сталіцай
Старая змеркнула Масква,
Як перад новаю царыцай
Парфіраносная ўдава.
Люблю цябе, Петра тварэнне,
Люблю твой строгі стройны від.
Невы дзяржаўнае цячэнне,
Берагавы яе граніт,
Узор тваіх чыгунных кратаў,
Начэй задумлівых тваіх
Святлісты змрок, бліск цемнаваты,
Калі ў пакоі сярод кніг
Пішу, чытаю без лампады,
Гляджу на сонныя грамады
Пустынных вуліц і святла
Адміраліцейская ігла,
І, не пускаючы начную
На небе цемру доўга жыць,
Адна зара спяшыць другую
У час кароткі замяніць.
Люблю зімы тваёй суровай
Марозу поўнчак каля хат,
Бег санкаў уздоўж Невы лядовай,
Красу ружовую дзяўчат,
І блеск, і шум, і гоман балаў,
А ў вечар халастой гульні
Шыпенне пеністых бакалаў
І пунша сінія агні.
Люблю жывую баявітасць
Пацешных Марсавых палёў,
Палкоў пяхотных і канёў,
Хаду іх, жывасць, самавітасць,
У зыбкім, маршавым страі,
Шматкі сцягоў, сцягоў пабедных,
Зіянне шапак гэтых медных,
Наскрозь прабітых у баі.
Люблю, ваенная сталіца,
Тваёй цвярдыні дым і гром,
Калі паўночная царыца
Падорыць сына ў царскі дом,
Ці перамогу над царом
Чужым святкуе зноў Расія,
Ці, свой Нева зламаўшы лёд,
Нясе яго да морскіх вод
І славіць з ім дні веснавыя.
Красуй, Пятровы горад, стой,
А непахісна, як Расія.
Хай супакоіцца з табой
І пакароная стыхія.
Варожасць, даўні палон свой
Хай хвалі фінскія забудуць
І марцай помстаю не будуць
Трывожыць вечны сон Петра.
Была жахлівая пара...
Жыве аб ёй успамінанне...
Аб ёй, сябры мае, для вас
Пачну сваё апавяданне.
Журботны будзе мой расказ.

Пераклаў ЯНКА КУПАЛА.

А. С. ПУШКІН

РУСЛАН І ЛЮДМІЛА

Урывак з паэмы

ПРЫСВЯЧЭННЕ

Для вас, душы маёй царыцы,
Для вас, красуні, для адных
Часоў мінулых небыліцы
Парой спачынкаў залатых
Пад шепт даўніны гаварлівай,
Пісаў я вернаю рукой;
Прыміце-ж працы плён гуллівы!
Хвальбы не трэ' мне ні чыёй.
Я шчасны ўжо надзеяй гожай
Што дзеўчына, калі яе
Любоў квіе, зірне, быць можа,
На песні грешныя мае.

ПЕСНЯ ПЕРШАЯ

Над сінім морам дуб зялёны;
На дубе залаты ланцуг:
І днём і ноччу кот вучоны
Па ланцугу ходзе свой круг.
Ідзе направа—спеў заводзіць,
Налева—казку завядзе.
Там пуда скрозь: лясун там бродаіць,
Русалка плешчацца ў вадзе.
Там на няведамых дарожках
Сляды нябачаных звярэй;
Хаціна на курыных ножках
Стаіць без вокан, без дзвярэй.
Праяў там поўны лес, даліны,
Зарою хвалі там прыхлынуць
На бераг мёртвы, дзе пяскі,
І трыццаць віцязяў ўрачыста
Чаргой выходзяць з хваль празрыстых,
А з імі дзядзька іх марскі.
Там каралевіч мімаходам
Палоніць грознага цара.
Там чараўнік перад народам,
І цераз лес і цераз воды
Нясе ў высі багатыра.
У цямніцы там царэўна тужыць,
Ёй шэры воўк аддана служыць,
Там ступа з Бабаю-Ягой
Ідзе, брыдзе сама сабой;
Там цар Кашчэй над скарбам чахне:
Там рускі дух... Там Руссю пахне!
І там я быў, і мёд я піў,
Ля мора бачыў дуб зялёны
Пад ім сядзеў, і кот вучоны
Свае мне казкі гаварыў.
Адну я помню: казку гэту
Цяпер расказваю я свету.

Падзеі дзён даўно былых
Паданні старыны глыбокай.
У грамадзе сыноў сваіх
З сябрамі ў хаце ў высокай
Уладзімір-сонца балаваў:
Сваю дачку ён выдаваў
За князя храбрага Руслана.
І мёд наліўшы ў шклянку з збана
За іх здароўе выпіваў.
Марудна елі продкі нашы,
І не спяшаліся кругом
Ахоплівіць з срэбра кубкі, чашы
З кіпучым півам і віном.
І весялосць яны дарылі,
Шыпела пена па краям.
Іх важна чашнікі насілі
І ў пояс гнуліся гасцям.
Размовы, быццам шум адменны,
Бурліць гасцей вясёлы круг,
Пачуўся раптам спеў прыемны
І звонкіх гусляў дзіўны гук.
Сціпала. Слухаюць Баяна:
Плсняр, прышчурыўшы свой зрок,
Люмілу славіць і Руслана
І Яслем звіты ім вянок.
Пачуццём страсным змардаваны
Руслан сумуе, закаханы,
На друга мілага глядзіць,
Злуецца, хмурыцца, гарыць,
Хвалюецца, свой вус шчыпае,
Не церпіць, кожны міг злічае.
У журбе, з нахмураным чалом,
Сядзяць за шлюбным за сталом
Утрох — ваякі маладыя.
Маўчаць перад збанком пустым,
Неўпамяць кубкі кругавыя
І ежа непрыемна ім.
Не чуюць вешчага Баяна,
Спусцілі долу свой пагляд,
То-ж тры саперніки Руслана
У душы сталі страшны яд —
Кахання, нянавісці чад.
Адзін — Рагдай, ваяка смелы,
Мячом рассунуў ён надзелы
Багатых кіеўскіх палёў.
Другі — Фарлаф, крыкун парожны,
На балях быў непераможны,
З мячом чураўся ён баёў.
Апошні повен думы бурнай
Ратмір — хазарскі хан. На жаль
Утрох сядзяць журботна, хмурна
Вясёлы баль для іх не баль.
Вось скончана; усталі госці
Гуртом гудуць, і ў весялосці
Усе глядзяць на маладых.
Нявеста вочы апусціла,
Як быццам сэрцам затужыла,
А зяць радасны жаніх.
Ды цень абняў усю прыроду,
Ідзе час поўначы глухой,
Базары, драмлючы ад мёду
Да дому рушылі гурбой.
Жаніх ляжа ў захапленні
І песніць ён сабе ўцяшэннем
Дзяўчыны слаўнай прыгажосць,
З таемным сумным заміленнем
Вялікі князь благаславэннем
Даруе любым маладосць.
І вось нявесту маладую
Вядуць на шлюбную пасцель;
Агні патухлі... і начную
Лампаду запаляе Лель:
Збылося мілае імкненне,
Кахання блізяцца дары;
Спадзе раўнівае адзенне
На царэградскія каўры...

Пераклаў АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Праф. Я. А. БРАНШТЭЙН

Горкі пра Пушкіна

«Пушкін любіў свабоду шчыра і горача». (Горкі).

Нібы два магутных уцёсы «ўзнесліся главою непакорлівай» два магутных тытаны вялікай рускай літаратуры — Пушкін і Горкі.

У творчым шляху гэтых двух геніяльных майстроў, аддзеленых адзін ад другога велізарнай гістарычнай дыстанцыяй, здавалася-б, на першы погляд, няма нічога агульнага.

Пушкін па свайму выхаванню і культуры належаў да рускага дваранства, да таго «вузкага кола людзей» перадавога дваранства пачатку XIX в., аб якіх Ленін гаварыў, што «страшэнна далёкі яны ад народу», хоць лепшыя з іх і «дапамаглі абудзіць народ». Горкі-ж сапраўдны выхадзец з народных нізоў, «чорная косць».

Аднак, варта ўважліва ўчытацца ў творы гэтых двух бессмертных мастакоў слова, каб пачуць тую гераічную пераклічку лепшых сыноў вялікага рускага народу, якая запаўняе гісторыю рускага рэвалюцыйнага руху на працягу «трох пакаленняў, трох класаў», як гаварыў Ленін.

Гэта — гераічны маршрут рускага народу — ад Радзішчэва і дзекабрыстаў, праз Герцэна да рэвалюцыянэраў-разначынцаў і ўшчыльную да рускага рабочага класа і яго партыі Леніна—Сталіна.

Сучасныя даследчыкі творчасці Горкага прыводзяць рад яркіх прыкладаў, якія сведчаць аб ідэйна-творчай залежнасці ранняга Горкага ад ранняга рамантычнага Пушкіна. У рамантычнай мары ранняга Горкага аб вольным, моцным чалавеку ці не чутна пераклічка з ранняй паэзіяй Пушкіна?

Крытыка з правам параўноўвала адпаведныя тэксты Пушкіна і раннята Горкага.

Але зразумела, не гэтым стылістычным і вобразным радством вычэрпваецца ідэйнае і творчае радство гэтых двух тытанаў рускай літаратуры.

Горкі з малых год быў страсным чытачом Пушкіна. Стомлены, пасля работы, нярэдка галодны, няўпэўнены ў сваім заўтрашнім дні, як многія мільёны падобных яму людзей працы ў капіталістычным грамадстве, малады Пешкоў — «масцеравы малярнага цэха» — забіраўся на чардак і зачытваўся чароўнымі вершамі Пушкіна.

У аповесці «В людях», у X раздзеле, Горкі расказвае аб невыказным захапленні, ахапіўшым яго пры чытанні вершаў Пушкіна.

«Я прачытаў іх усе адразу, ахоплены тым-жа прагным пачуццём, якое адчуваеш, нападаючы ў нябачана прыгожае месца, — заўсёды імкнешся аббегчы яго адразу. Так бывае пасля таго, калі доўга ходзіш па мохавых купінках балоцістага лесу, і нечакана развернецца перад табой сухая паляна, уся ў кветках і сонцы».

Такой палянай, утапаючай у кветках і ў сонцы, успрыняў юнак-масцеравы творы Пушкіна. Пушкін адразу ўвайшоў у свядомасць Горкага, як стары друг, родны яго думкам і чаянням.

Горкі быў захоплен музыкай верша Пушкіна. Ён, будучы ўжо геніяльным майстрам слова, не раз захапляўся «чароўнай салодкасцю» вершаў Пушкіна. У рэцэнзіі на расказы Івана Новікава (у 1911 годзе) Горкі папракае аўтара ў неахайнасці мовы і раіць вучыцца гучнасці мовы ў Пушкіна:

«Восемдзесят год таму назад А. С. Пушкін, напісаўшы «грузинка красивая», прасіў прыяцеля выправіць непрыгожае злучэнне складоў — «инка кра» — зараз усе гаворыць і пішуць аб прыгожасці формы і бестурботна скажаюць рускую мову».

Буржуазныя эстэты эпохі царскай рэакцыі, наступіўшай пасля рэволюцыі 1905 года, з скуры вон лезлі, каб абвясціць Пушкіна сваім і залічыць яго па ведамству «жрэцоў чыстага мастацтва».

Але хіба Пушкін меў калі-небудзь хоць частковае падабенства з буржуазнымі прыхільнікамі «чыстай формы»?

Горкі добра ведаў, што веліч Пушкіна іменна ў яго «тэндэнцыёзнасці», гэта значыць у яго ідэйным багацці. Горкі цаніў Пушкіна перш за ўсё, як «усёведаўшага Александра Пушкіна» — чалавека вялікай сапраўднай чалавечай культуры.

У артыкуле аб Пушкіне, напісаным у 1907 годзе і толькі нядаўна апублікаваным, Горкі падкрэслівае ідэйнае багацце пушкінскай творчасці, яе арганічную сувязь з сацыяльнай практыкай.

Пушкін ніколі не ганяўся за фармальнымі набракушкамі. Ён быў вораг фармалістычнай бессэнсоўнасці, Пушкін з гэтага повазу пісаў: «Ёсць два роды бессэнсоўнасці: адна адбываецца ад недахопу пачуццяў і мысляў, замяняемага словамі; другая — ад паўнаты пачуццяў і мысляў і недахопу слоў для іх выражэння».

Горкі цаніў у Пушкіна паўнату пачуццяў і мысляў.

Горкі вельмі рана прыйшоў да выдатнай мыслі аб тым, што Пушкін, чый «асабісты вопыт быў шырай і глыбей вопыту дваранскага класа», не мог не ўзняцца «над сваёй класавай абмежаванасцю і стаць сапраўдным паэтам народу».

Гэтую выдатную мысль, рэзка процілеглую ўсякім вульгарна-сацыялагічным схемам, то аб дваранстве, то аб буржуазнасці Пушкіна, Горкі сцісла фармулюе ў памянёным артыкуле аб Пушкіне (1907 г.). Горкі піша:

«На прыкладзе яго творчасці мы бачым, што пісьменнік, багаты веданнем жыцця, так сказаць, перагружаны вопытам, — у сваіх мастацкіх абагульненнях (у вобразах Еўгенія Онегіна, графа Нуліна, Дуброўскага і т. д.) выходзіць з рамак класавай псіхікі, узвышаецца над тэндэнцыямі класа...

Несумненна, што Пушкін — дваранін, ён сам адзін час ганарыўся гэтым, — але нам важна ведаць, што ўжо ў юнацтве сваім ён адчуў цеснату і духату дваранскіх традыцый, зразумеў інтэлектуальнае жабрацтва свайго класа»...

Пушкін,—гаворыць далей Горкі,—«адчуваў, што для яго інтарэсы ўсёй нацыі вышэй інтарэсаў аднаго дваранства».

Так Горкі ўладарна заяўляе права рускага народу над творчай спадчынай Пушкіна.

Ужо ў раннія свае гады, зачытваючыся Пушкіным, Горкі цаніў у ім яго сапраўдную народнасць.

Расказваючы ў аповесці «В людях» аб сваім першым непасрэдным уражанні пры чытанні Пушкіна, Горкі падкрэслівае:

«Пралог да «Руслана» нагадваў мне лепшыя казкі бабулі...» «Цудоўныя казкі Пушкіна былі ўсё бліжэй і зразумелы мне...»

Пушкін — па думцы Горкага — адзіны з літаратараў-дваран, які звярнуў увагу на фальклор.

Пушкін таму стаў роданачальнікам рускай літаратуры, што ён зразумеў неабходнасць зрабіць літаратуру даступнай мільёнам.

Гэтую барацьбу за народнасць літаратуры прадаўжаў Горкі на працягу ўсяго свайго творчага жыцця.

У артыкуле «Аб тым як я вучыўся пісаць» Горкі гаворыць:

«Да рэчы будзе напомніць, што мова стварэецца народам. Дзяленне мовы на літаратурную і народную значыць толькі тое, што мы маем, так сказаць, «сырую» мову і зпрацаваную майстрамі. Першым, хто добра зразумеў, гэта быў Пушкін, ён жа першы і паказаў, як неабходна карыстацца матэрыялам гутаркі народу, як трэба апрацоўваць яго».

Пушкін, як вядома, зразумеў гэта ўжо ў раннім сваім творы «Руслан и Людмила».

Народная мова «Руслана» шакіравала ні аднаго рыцара барскай «чыстаты» мовы.

Зразумела, народнасць Пушкіна не зводзіцца да фальклорнасці ў яго творчасці, к «просторечию».

Горкі залічыў Пушкіна да тых майстроў, якія «ўвасабляюць дух народу з найбольшай прыгожасцю, сілай і поўнасцю». Таму і Пушкін з правам мог чакаць, што «к нему не зарастет народная тропа», бо ён увасобіў сабой лепшыя гераічныя рысы вялікага рускага народу.

За знешне-благанамернымі (для нікалаеўскай цэнзуры) адпіскамі аб «рускім бунце, бессэнсоўна жорсткім», хавалася мучыцельнае жаданне Пушкіна вяснець благародства, суровую веліч «мужыка з сякерай». Хіба не суровай веліччу і благародствам авеяны вобраз Пугачова ў «Капітанскай дочке»?

Хіба не велічавы «безмолвствующий народ» у трагедыі Пушкіна «Борис Годунов»? (Гэта яшчэ ў свой час адзначыў Белінскі).

Пушкін яшчэ ў першыя гады сваёй творчасці любоўна збіраў песні і сказанні народу пра Сцепана Разіна. Разіна Пушкін лічыў, па словах Горкага, «адзінай паэтычнай асобай у Расіі».

Горкі цаніў Пушкіна, як вялікага сына вялікага народу.

Свае выдатныя артыкулы пра Пушкіна Белінскі закончыў словамі:

«Да асаблівых уласцівасцей яго паэзіі належыць яе здольнасць развіваць у людзях пачуццё прыгожасці і пачуццё гуманнасці, разумеючы пад гэтым словам бясконцую павагу да дастоінства чалавека як чалавека».

Пролетарскі гуманіст — Горкі — не зхіт не палюбіць Пушкіна за гэта пачуццё гуманнасці і бясконцую павагу да дастоінства чалавека як чалавека. Гэты благародны сцяг барацьбы за дастоінства чалавечай асобы Пушкін узняў у змрочныя гады нікалаеўскай рэакцыі.

У імя папранага чалавечага дастоінства Пушкін граміў не толькі саноўную свецкую чэрань — усю гэту зграю льсцяцоў, «халопаў добраахвотных», «какетак багамольных», «злодзеяў смешных і сумных» і т. п.

Пушкін бачыць з вышкі свайго генія ўсю гніль і прадажнасць эгаістычнага індывідуалізма. Ужо ў паэме «Цыганы», Пушкін бічуе тых, якія «для сябе толькі хочуць волі». Індывідуалізму Алеко процістаўляецца сапраўднае вольналюбства народу, увасобленага ў старыку—бацьку Земфіры.

Горкаму належаць выдатныя мыслі аб барацьбе Пушкіна за чалавечае дастоінства. У артыкуле аб Пушкіне Горкі з выключнай глыбінёй растлумачае сутнасць вядомых спрэчак аб «шасцісотгадовым дваранстве» Пушкіна.

Прыводзячы рад месц з перапіскі Пушкіна, Горкі даказвае, што «шасцісотгадовым дваранствам» Пушкін прыкрываў, як-бы шчытом, свае чалавечае дастоінства ад насягальніцтва саноўных мярзотнікаў тыпу графа Варанцова.

Фёдар Дастаеўскі, якога Горкі назваў «злой геній наш»,—наперакор разважнаму сэнсу і ісціне абвясціў Пушкіна апосталам пакорнасці. Горкі ў прыгожых палкіх радках абараняе Пушкіна ад Дастаеўскага. Горкі процістаўляе Пушкіна Дастаеўскаму:

«Я палічыў-бы за лепшае, — піша Горкі ў артыкуле «Аб літаратуры» (1930 г.), — каб «культурны свет» аб'яднаўся не Дастаеўскім, а Пушкіным, бо велізарнейшы і універсальны талент Пушкіна — талент псіхічна здаровы і аздараўляючы».

Такім-жа талентам — псіхічна здаровым і аздараўляючым быў Горкі.

Горкі і Пушкін — два светлых геніі вялікага рускага народу — засталуцца ў стагоддзях.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ДВУХСОТНІКАЎ

Два месяцы таму назад па закліку і ініцыятыве лепшых стаханаўцаў Гомеля на прадпрыемствах пачаў разгортвацца рух двухсотнікаў. За два месяцы напружанай работы ў рады стаханаўцаў-двухсотнікаў, улілося 500 рабочых.

3 лютага адбылася канферэнцыя двухсотнікаў, якая падвяла першыя вынікі гэтага выдатнага руху за новы ўздым прадукцыйнасці працы, намеціла задачы для далейшага разгортвання стаханаўскага руху на прадпрыемствах.

На канферэнцыі прысутнічала 400 двухсотнікаў. Яны расказалі аб вопыце сваёй работы і ўскрылі недахопы, якія перашкаджаюць росту прадукцыйнасці працы.

Комуніст-двухсотнік, токар завода «Гомсельмаш» тав. Вагапаў падрабязна расказаў канферэнцыі, якім шляхам ён дабіўся выканання свайго задання ад 200 да 300 процантаў за змену. Тав. Вагапаў расказаў аб падборы інструментаў, арганізацыі рабочага месца, аб уласным энтузіязме, аб усім, што вывела яго ў рады лепшых стаханаўцаў Гомеля.

Але тут-жа былі ўскрыты буйныя недахопы работы «Гомсельмаша». На гэтым прадпрыемстве налічваецца тысяча рабочых, але да гэтага часу толькі 25 дабіліся выканання плана больш 200 проц., ёсць больш 100 рабочых, якія яшчэ не выконваюць новых норм.

На камбінаце імя Гікало ёсць не мала такіх выдатных людзей, як стаханавец абознага цэха тав. Вайнштэйн, якія выконваюць свае нормы да 300 проц. Аднак гэты камбінат за студзень выканаў план толькі на 61,3 проц. Горш усяго тое, што кіраўніцтва камбіната прывівае рабочым думку аб тым, што ўся прычына невыканання плана крыецца толькі ў адсутнасці сыравіны.

Стаханавец «Палесдруку» тав. Фішбэйн расказаў канферэнцыі аб тым, як ён у гонар Надзвычайных З'ездаў Саветаў павысіў прадукцыйнасць сваёй працы да 300 проц. Але ў «Палесдруку» не клапоцяцца аб забеспячэнні стаханаўцаў неабходнымі матэрыяламі, і яны не заўсёды маюць магчымасць працаваць так, як патрэбна.

Стаханаўка кандзіцерскага камбіната «Спартак» Баркова дабілася выканання плана на 340 проц. Такіх на «Спартаку» шмат. Але з прычыны дрэннай работы кіраўніцтва камбіната ён выканаў план за студзень толькі на 88,3 проц.

Двухсотнікі ў сваіх выступленнях ўскрылі вялікія, яшчэ не вычарпаныя рэзервы, выкарыстанне якіх можа даць вялікае павышэнне прадукцыйнасці працы.

Канферэнцыя прыняла рад абавязацельстваў: ахапіць усіх рабочых соцыялістычным спаборніцтвам і выканаць гадавы план па ўсёй прамысловасці Гомеля да XX гадавіны Кастрычніцкай пролетарскай рэволюцыі, правесці праверку выканання рацыяналізатарскіх прапаноў і арганізаваць збор новых рацыяналізатарскіх прапаноў.

З 1 па 15 сакавіка будзе праведзена праверка соцыялістычных дагавораў на ўсіх прадпрыемствах Гомеля. **ПЯТРОЎ.**

ЧАЦВЕРТЫЯ УСЕСАЮЗНЫЯ ЗАВОЧНЫЯ ХІМІЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ АСОАВІЯХІМА

Каманды вышлі на старт

У гарадах і раёнах БССР першага лютага пачаліся чацвертыя ўсесаюзныя завочныя хімічныя спаборніцтвы. Першымі вышлі на старт спаборніцтваў хімічныя каманды Магілева, за імі трэцяга лютага вышлі каманды Гомеля. 6 лютага з вялікім уздымам і арганізавана вышлі на старт хімічных спаборніцтваў 106 каманд сталіцы БССР (усяго ў Менску будзе ўдзельнічаць 228 каманд).

У першы дзень спаборніцтвы праходзілі па двух практыкаваннях: пераход у процігазах (на тры кілометры для мужчын і на два кілометры для жанчын) і змена процігаза ў заражаным паветры. Лепшыя вынікі па пераходу дала каманда работніц завода імя Варашылава, якая прайшла гэту адлегласць за 12 мінут 07 секунд. Каманда хатніх гаспадынь жакта № 33 прайшла за 13 мінут 33 секунды, жакта № 12 за 15 мінут 24 секунды. Адлегласць у тры кілометры першай прайшла за 18 мінут 32 секунды мужская каманда горжылсаюза. Каманда пажарнай аховы НКУС БССР адстала ад яе на 18 секунд.

Па змене процігаза пяршынства ўзялі каманды работнікаў ашчадкасы № 16 і ФЗУ імя КІМ. Іх вынік 5 секунд. Каманда дэгазацыйнага ўзвода змяніла процігазы за 6,9 секунды, каманда дэпутатаў горсавета — за 8 секунд.

З вялікай актыўнасцю змагаюцца за пяршынства ў гэтых спаборніцтвах хатнія гаспадыні Менска. Характэрны прыклад. У часе пераходу ў процігазе на 2 кілометры ў хатняй гаспадыні з каманды жакта № 6 т. Радашкоўскай здзеўся з нагі чаравік. Каб не сарваць пераходу тав. Радашкоўская прайшла па галалёдзіцы 900 метраў у адной панчосе. У выніку яе каманда за пераход атрымала ацэнку добра. **В. Н.**

„ДЭКАДА МАСТАЦТВАЎ" ДЛЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Усесаюзны камітэт па справах мастацтваў, усесаюзны радыёкамітэт, цэнтральныя камітэты прафсаюзаў работнікаў мастацтваў і кінаработнікаў праводзяць з 18 лютага па 1 сакавіка «дэкаду мастацтваў» для часцей Чырвонай арміі і НКУС.

У падрыхтоўку да гэтай дэкады ўключыліся ўсе тэатры, кіно, радыёкамітэты і музычныя ўстановы БССР. На працягу дэкады будуць арганізаваны выезды ў падшэфныя часці з паказам сваіх работ. У праграму ўключаны спектаклі, даклады, канцэрты, дэманстрацыя кінофільмаў. Будуць наладжаны ранішнікі для дзяцей начальніцкага складу.

У кіраўніцтве па справах мастацтваў пры СНК БССР адбылася спецыяльная нарада, на якой распрацаван план правядзення «дэкады мастацтваў» у часцях Чырвонай арміі па БССР. Апрача выездаў у часці, тэатры, музычныя ўстановы дадуць спектаклі і канцэрты для чырвонаармейцаў і камандзіраў на сваіх стацыянарных базах. Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета ставіць на сцэне Н-скага палка оперу «Севільскі цырульнік». Спектаклі і канцэртныя вечары рыхтуюць БДТ-1 і Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр. Кінатэатры наладжваюць 24 лютага дзённыя сеансы для жонак і дзяцей начальніцкага складу. Кінаперасоўкі абслужаць пагранічныя заставы БССР. У менскіх кінатэатрах выдзяляецца 15 пастаянных месц для камандзіраў часцей менскага гарнізона. Кансерваторыя і музычная школа выдзяляюць 4 брыгады для абслугоўвання часцей Чырвонай арміі ў часе дэкады. 22 лютага Беларускі радыёкамітэт арганізуе канцэрт на тэму «Чырвоная армія ў творчасці беларускіх кампазітараў». **В. П.**

Студэнты гомельскага песатэхнічнага інстытута арганізавалі пушкінскі вечар. Пасля даклада аб творчасці вялікага рускага паэта была паказана інсцэніроўка паэмы А. С. Пушкіна «Цыганы». НА ЗДЫМКУ: сцэна з пастаноўкі.

Фото Соркіна (БСФ).

ВЕЧАР ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ПАЭТА

6 лютага ў клубе імя Сталіна (Менск) рабочыя і работніцы фабрыкі «Комунарка» ўшаноўвалі памяць вялікага рускага паэта Александра Сергеевіча Пушкіна. З выключнай увагай 500 удзельнікаў вечара праслухалі даклад прафесара Бранштэйна аб творчасці геніяльнага сына рускага народу.

Пасля даклада быў наладжан літаратурна-музыкальны канцэрт пры ўдзеле артыстаў і сімфанічнага аркестра Беларускага радыёкамітэта. Выступленне артыстаў Некрасава і Новік з выкананнем твораў А. С. Пушкіна пакінула прыемнае ўражанне. **П. К.**

САМАДЗЕЙНАСЦЬ ПА РАДЫЁ ДА ПУШКІНСКІХ ДЗЁН

Да пушкінскага юбілею радыёкамітэт пры СНК БССР арганізоўвае некалькі перадач-выступленняў самадзейных калектываў і выканаўцаў-адзіночак, прысвечаных памяці вялікага рускага паэта Александра Сергеевіча Пушкіна. Першая такая перадача адбудзецца 10 лютага ў 21 гадзіну.

Ля мікрафона выступяць удзельнікі мастацкай самадзейнасці менскага завода імя Варашылава. Духавы аркестр гэтага завода выканае увертюру да оперы Чайкоўскага «Пиковая дама» і папуры з оперы «Евгений Онегин». Хор выканае тры творы на словы А. С. Пушкіна «Узник», «Зимний вечер» і «Послание в Сибирь». Оперная група выканае ўрыўкі з оперы Чайкоўскага «Евгений Онегин»: сцэну ў садзе і сцэну дуэлі. Апрача таго, удзельнікі драматычнага гуртка прачытаюць вершы Пушкіна «Деревня», «К Чаадаеву» і інш.

15 лютага ў 21 гадзіну ля мікрафона выступяць гурткі самадзейнасці гарадоў Віцебска, Менска і Рэчыцы. **РАГІНСКАЯ.**

У ПАРЫЖ—НА КРОС „ЮМАНІТЭ"

Учора раніцой кур'ерскім поездам праехала праз Менск каманда совецкіх спартсменаў, якая накіроўваецца ў Парыж для ўдзелу ў традыцыйным спартыўным свяце — кросе на прыз газеты французскай компартыі «Юманітэ». У складзе совецкай каманды 9 лепшых бегуноў краіны, з іх тры жанчыны; вядомыя далёка за межамі Саюза заслужаныя майстры спорту СССР браты Серафім і Георгій Знаменскія, Маляеў, майстры спорту Іваньковіч (былы чэмпіён БССР), чырвонаармеец Панёмін, кіеўлянін Савельеў, рэкардсменка Саюза Еўдакія Васільева і кросменкі Собалева і Зайцэва. Узначальвае каманду начальнік замежнага аддзела Усесаюзнага камітэта па справах фізкультуры і спорту пры СНК СССР тав. Распевін.

Крос «Юманітэ» адбудзецца 14 лютага ў парыжскім парку «Ля Курнаў». Совецкія бегуны прымаюць удзел у кросе ў другі раз. Упершыню яны аспрэчвалі прыз «Юманітэ» — «кубак адзінства» ў 1935 г. і выйгралі яго.

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» глава каманды тав. Распевін паведаміў наступнае:

«Крос у гэтым годзе ў спартыўных адносінах вельмі цікавы, дзякуючы ўдзелу каманд Іспаніі і Бельгіі. Французскае спартыўнае аб'яднанне больш моцнае, чым у 1935 годзе. У гэтым кросе пабягуць упершыню спартсмены СССР. Уся наша каманда фізічна добра падрыхтавана і знаходзіцца ў выдатнай спартыўнай форме. Настрой — баявы, едзем перамагчы. Мы выязджаем на некалькі дзён раней з тым, каб на месцы ў Парыжы патрэніравацца на лыстанцыях».

У Парыж каманда прыбудзе раніцой 10 лютага. **І. ЦЫВЕС.**

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА РУСКАГА ХІМІКА Д. І. МЕНДЭЛЕЕВА

7 лютага ў Акадэміі навук БССР адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 30-годдзю са дня смерці вялікага рускага хіміка Д. І. Мендэлеева. Пасяджэнне было арганізавана аддзяленнем прыродазнаўчых і матэматычных навук Акадэміі разам з Беларускім аддзяленнем усесаюзнага мендэлееўскага таварыства.

Адзначыць памяць Д. І. Мендэлеева прышлі работнікі Акадэміі, Дзяржаўнага універсітэта і навукова-даследчых інстытутаў.

Пасяджэнне адкрылася ўступным словам акадэміка Афанасьева. Вялікі даклад аб светапоглядзе і творчасці Д. І. Мендэлеева зрабіў член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР праф. Б. М. Шпенцэр.

Дакладчык адзначыў выключнае значэнне навуковай спадчыны геніяльнага рускага хіміка Д. І. Мендэлеева, якая рэалізавана была толькі пры совецкай уладзе. Царскі ўрад не ацаніў генія Мендэлеева.

В. І. Ленін прыдаваў вялікае значэнне навуковым прагнозам Мендэлеева. У рэзультаце выканання двух сталінскіх пяцігодак працоўныя Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна рэалізавалі каштоўныя ідэі Мендэлеева ў галіне стварэння магутных індустрыяльных камбінатаў, як Берэзнікі, Бобрыкі, Магнітагорск, Караганда. Ідэя паземнай газіфікацыі, прапанаваная Д. І. Мендэлеевым і ўхваленая В. І. Леніным, рэалізуецца ў нас — у Данбасе і падмаскоўным басейне.

Мендэлееў — наш. Рабочы клас Совецкага Саюза з'яўляецца адзіным наследнікам Мендэлеева і ўсё каштоўнае, што ёсць у яго працах, рэалізуе.

Навуковая спадчына Мендэлеева вялікая, але совецкая навуковая думка ў лабараторыях і на заводах стварае і стварыць каштоўнасці, аб якіх і не мог мярыць геніяльны вучоны.

Прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Змачынскі выступіў з дакладам на тэму «Аб перыядычнай сістэме элементаў» Мендэлеева. **М. КІН.**

РАДАСЦЬ ШЧАСЛІВАГА МАЦЯРЫНСТВА

«Дзіцячая кансультацыя» — суха апавяшчае шыльда. Але варта толькі адкрыць дзверы і зайсці ў гэта памяшканне, як усёй істотай адчуеш цёплую, іскрыстую радасць шчаслівага мацярынства. Вялікі і ўрачыста гэта радасць совецкай маці.

У гэтай звычайнай совецкай установе можна прасачыць, як ва ўсёй паўнаце праяўляюцца сталінскія клопаты аб нашым падрастаючым пакаленні. Тут, як нідзе, можна бачыць, як шчадра саграецца сталінскім сонцам шчаслівае дзяцінства самых маленькіх грамадзян вялікага і непераможнага Совецкага Саюза.

У чакальным пакоі на спецыяльных століках стаяць, сядзяць і ляжаць, гарэліва размахваючы пульхнымі ружовымі ручкамі і ножкамі, маленькія крапышы. Сочыш за іх энергічнымі рухамі і мімаволі думаеш словамі нядаўна выпушчанага плаката: «Счастливые родятся под советской звездой». У гутарках між сабой маці з асаблівай пеплынёй расказвае пра ўсе дробязі сваіх дзяцей.

— Ён учора ўжо сказаў «да, да»... — гаворыць адна маці.

— А мой штосьці сёння дрэнна спаў,— скардзіцца другая.

— А мая ўчора самастойна зрабіла некалькі крокаў, — з гонарам паведамляе трэцяя.

У габінеце галоўнага ўрача трэцяй менскай кансультацыі тав. С. Б. Аранзон чатырохмесячны Леанід — сын навуковай супрацоўніцы Наркамата аховы здароўя БССР тав. Элькінай — энергічна размахвае ручкамі.

— Ух, які ты моцны!, — аглядаючы яго, гаворыць тав. Аранзон. — Ён у нас амаль з першага дня свайго жыцця выхоўваецца на грудным малацэ зліўнога пункта, які ёсць пры нашай кансультацыі. Яго маці пасля родаў захварэла мастытам грудзі.

Штодзенна з 10 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара 8 урачоў кансультацыі вядуць прыём дзяцей. Задача іх і кансультацыі ў цэлым памагчы мацерам выхоўваць здаровае пакаленне. Ёсць пры кансультацыі і ўрач па вушных хваробах, ёсць і юрыст, які дапамагае мацерам-алзіночкам у аліментных, кватэрных і іншых пытаннях.

Кожны ўрач кансультацыі замацаван за пэўным участкам горада, за якім ён сочыць і дапамагае мацерам выхоўваць дзяцей з дня іх нараджэння да 4-гадовага ўзросту. Аб нованарадзіўшыхся дзецях кансультацыя атрымлівае весткі з радзільных дамоў і пасылае на кватэры рожаніц сяспёр для азнаямлення з доглядам дзяцей. Урачы таксама робяць рэгулярна абыходы кватэр, дзе даюць так званыя ўрачэбныя патранажы.

Такія клопаты аб нашым падрастаючым пакаленні могуць быць толькі ў краіне соцыялізма, у краіне Сталінскай Канстытуцыі. **Н. ВІШНЕЎСКІ.**

ЗДАРЭННІ

Арышт злодзеяў-узломшчыкаў. Першым аддзяленнем горада Менска затрыманы буйныя злодзеі-ўзломшчыкі Дземяновіч А. С. і Нутарцаў В. П. без пэўных заняткаў, якія сістэматычна займаліся пакражамі-ўзломамі з магазінаў. У ноч на 27 лістапада мінулага года, шляхам падбору ключоў, яны абакралі магазін № 8 на плошчы 8-га Сакавіка, пакрашы розных рэчаў на суму 1.478 руб. 82 кап. У ноч на 20 кастрычніка мінулага года пакралі прадуктаў і спіртных напіткаў з магазіна № 6 на плошчы 8-га Сакавіка на суму 1.342 руб. У ноч на 17 студзеня гэтага года, шляхам узлому рашоткі магазіна № 66 па Нямігскай вуліцы, яны пакралі розных рэчаў на суму 1.865 руб. Таксама яны прабавалі шляхам узлому абакрасці абутковы магазін па Нямігскай вуліцы, мануфактурны магазін № 10 на рагу Набяжнай і плошчы 8-га Сакавіка. 31 студзеня гэтага года пры спробе зрабіць пакражу з магазіна «Метызбыта» па Інтэрнацыянальнай вуліцы злодзеі-ўзломшчыкі былі затрыманы. Дземяновіч і Нутарцаў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

ДЗЕННІК

* Чарговыя заняткі курсаў партыйнага актыва, сакратароў парткомаў і парторгаў адбудуцца 10 лютага ў 6 гадзін вечара ў вялікай залі Дома партактыва.

* Даклад акадэміка Вальфсона на тэму «Аб светапоглядах Пушкіна» для партактыва Варашылаўскага раёна адбудзецца 9 лютага ў 7 гадзін вечара ў памяшканні клуба Працасветы (Комуністычная, 19). Пасля даклада выступленні пісьменнікаў БССР і кіно. Білеты можна атрымаць у Варашылаўскім райкоме КП(б)Б (пакой № 13).

* Чарговы семінар для прапагандыстаў, скончыўшых курсы пры гаркоме і ЦК КП(б)Б адбудзецца 9 лютага ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (пакой № 21).

* Семінар работнікаў шматтыражак і насценных газет адбудзецца ў памяшканні Дома партактыва 9 лютага ў 7 гадзін вечара.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б

ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ ФІЛІЯЛАХ, РАЙКНІГАРНЯХ І КНІЖНЫХ КІЁСКАХ

—КЛАСІКІ— МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

(на беларускай мове), якія ВЫЙШЛІ З ДРУКУ і разасланы на месцы:

К. МАРКС. — Наёмная праца і капітал (выданне 1937 г.). Ц. 95 к.

Ф. ЭНГЕЛЬС. — Анты-Дзюрынг. Ц. 3 р. 50 к.

В. І. ЛЕНІН. — Аграрнае пытанне і «Крытыка Маркса». Ц. 1 р. 35 к.

І. СТАЛІН. — Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне. Ц. 2 р.

І. СТАЛІН. — Пытанні ленінізма (выд. X). Ц. 4 р.

НАРКОМПИЩЕПРОМ СССР ГЛАВПАРФЮМЕР

ЛУЧШИЕ ЦВЕТОЧНЫЕ ОДЕКОЛОНЫ

ИМЕЮТ СТОЙКИЙ И НЕЖНЫЙ ЗАПАХ

требуйте всюду

БЕЛКАНТОРА ЗАГОТЛЁН

ПРАДАЕ ПАСЕУНАЕ НАСЕННЕ ЧЫРВОНАЙ КАНЮШЫНЫ

ПРАЗ СВАЕ АДДЗЯЛЕННІ ў наступных раёнах:

АСВЕІ, ОРШЫ, БЕШАНКОВІЧАХ, БАГУШЭЎСКУ, БЯЛЫНІЧАХ, БАРЫСАВЕ, БУДА-КАШАЛЕВЕ, БЫХАВЕ, БІРЗЫНЕ, ВЕТРЫНЕ, ВІЦЕБСКУ, ГАРАДКУ, ГОРКАХ, ДРЫСЕ, ДУБРОЎНЕ, ДРЫБІНЕ, СТ. ГАРОЧЫНЫ, (ДАМАНАВІЧЫ), ЖЛОБІНЕ, ДОЎСКУ (ЖУРАВІЦКІ РАЁН), КАСЦЮКОВІЧАХ, КРУПКАХ, КЛІМАВІЧАХ, КРЫЧАВЕ, КАРМЕ, ЧЫРВОНАПОЛЛІ, ЛЕЗНЕ, ЛЕПЕЛІ, СТ. УЗДАСЫ (МСЦІСЛАЎЛЬ), СТ. БЫЧЫХА (МЕХАВА), МАГІЛЕВЕ, ПОЛАЦКУ РАСОНАХ, РЭЧЫЦЫ, СЯННО, СІРОЦІНЕ, СУРАЖЫ, НОВАБЕЛІЦЫ (ГОМЕЛЬ), УШАЧАХ, УВАРАВІЧАХ, ХОЙНІКУ, ХОВІНКАХ, ХАЛОПЕНІЧАХ, ЧАШНІКАХ, ЧАВУСАХ, ШКЛОВЕ, ЕЛЬСКУ, ТЭРВЕЛІ і ПА МОЗЫРСКАМУ РАЁНУ НА СТ. КАЛІНКАВІЧЫ.

Праз пункты Заготзярно ў раёнах:

АСІПОВІЦКІМ, ЖЫТКАВІЦКІМ, ЗАСЛАЎСКІМ, КЛІЧАЎСКІМ, ЛОЕЎСКІМ, МЕНСКІМ, ПАРЫЦКІМ, ПРАПОЙСКІМ, ПЕТРЫКАЎСКІМ, СМАЛЯВІЦКІМ, СТАРАДАРОЖСКІМ, ЧАЧЭРСКІМ, ЧЭРЫКАЎСКІМ.

Праз райзагі спажыўкааперацыі ў раёнах:

БРАГІНСКІМ, БЯГОМЛЬСКІМ, ГЛУСКІМ, ДОБРУШСКІМ, КАМАРЫНСКІМ, КАПАТКЕВІЦКІМ, ЛАГОЙСКІМ, ЛЕЛЬЧЫЦКІМ, ЛЮБАНЬСКІМ, НАРАЎЛЯНСКІМ, ПЛЕШЧАНІЦКІМ, ТУРАЎСКІМ і СВІСЛАЧОЦКІМ.

ПРОДАЖ НАСЕННЯ праводзіцца па даўжэйшых адпускных цэнах усім спажыўцам у НЕАБМЕ ЖАВАНАЙ КОЛЬКАСЦІ.

БЕЛЗАГОТЛЁН.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ЎСЕСАЮЗНАГА ІНСТЫТУТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ЗАРКАМЗЕМА СССР ПРЫ ГОРАЦКІМ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ

абвяшчае ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ.

1. НА ЗАВОЧНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ па спецыяльнасці ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ І ПАЛЯВОДСТВА, з папярэднімі іспытамі (заочна) в 5 объем курса сярэдняй школы, па палітграмаце, рускай і беларускай мовах матэматыцы, фізіцы, хіміі і геаграфіі. Тэрмін навучання ад 5 да 6 год.

2. НА ЗАВОЧНАЕ ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ спецыялістаў сельскай гаспадаркі з закончанай вышэйшай і сярэдняй сельскагаспадарчай асветай. Тэрмін навучання на курсах 1 месяц.

Паступаючыя падаюць дакументы: заяву, засведчаную фотаблянкаю, аб асвеце (арыгінал), метрычны выпіс, даведку месца работы, а камандыруемыя і камандыровку.

Прыём заяў да 15 лютага.

Прыём іспытаў (заочна) з 15 лютага да 15 сакавіка 1937 г.

Залічэнне ў лік студэнтаў-заочнікаў з 15 сакавіка да 1 красавіка 1937 г.

Заявы і запытанні аб падрабязнасцях прыёму накіроўваць па адрасу: БССР, Горкі, Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, заочнае аддзяленне.

НАРКАМЗЕМ БССР.

ГАЛОЎНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ ПА ЯКАСЦІ ТОРФУ „ГИКТОРФ" НКЦП СССР

ПАВЕДАМЛЯЕ,

што па абвешчанаму ў газеце «Звязда» ад 1 снежня 1936 г.

№ 275 КОНКУРСУ

на праекты канструкцый аўтаматаў, механізмаў і прыстасаванняў па адбору проб торфу АПОШНІ ТЭРМІН

прадстаўлення праектаў, з прычыны заяў раду вынаходнікаў,

ПЕРАНОСІЦЦА з 1 лютага на 30 САКАВІКА 1937 г.

«ГИКТОРФ».

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!

Рознічны Магазін Белшвэйснабзбыта

(Совецкая, 97/7. Тэлефон № 22-357)

БШТ БЕЛАРУСКІ ШВЕЙТРЭСТ

МАЕ штодзенна ў продажы

МУЖЧЫНСКІЯ ПАЛІТО ЗІМОВЫЯ, КАСЦЮМЫ ВЫСОКАЯКАСНЫЯ І ЗВЫЧАЙНЫЯ, ПІДЖАКІ І БРУКІ АСОБНА, БЯЛІЗНА РОЗНАЯ І ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ.

ЖАНОЧЫЯ ДЭМІ-ПАЛІТО, КАСЦЮМЫ, ПІАЖОКОВЫЯ І ШАРСЯНЫЯ ПЛАНЦІ, БЛЮЗКІ ПІАЖОКОВЫЯ І СПАДНІЦЫ ШАРСЦЯНЫЯ, БЯЛІЗНА ЖАНОЧАЯ І ПАСЦЕЛЬНЫЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦІ.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЗІМОВЫЯ І ДЭМІ-ПАЛІТО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ШКОЛЬНАГА І ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ І СУКОННЫЯ КАСЦЮМЧЫКІ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. 21-845

ДРУКАРНІ «ЗВЯЗДА»

ПАТРЭБНЫ

на пастаянную работу:

ДРУКАРЫ-«АМЕРЫКАНШЧЫКІ», РАБОТНІКІ АХОВЫ, ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.

Зварачацца Совецкая, 63. 2-гі паверх, з 12 да 1 г. дня

СЕНЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)

9 лютага Абан. № 34. ВАЎКІ І АВЕЧКІ

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

9 лютага Абан. № 67. ВАКАТ

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» ДУБРОЎСКІ

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» ВЫПАДКОВАЯ СУСТРЭЧА

Дзіцячы гукавы кінатэатр ФЕЛЗЬКА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» ФЕЛЗЬКА

Гукавы кінатэатр «Спартак» ДА ПАДЗЕЙ У ІСПАНІІ

з 1 па 12 выпуск — 12 выпускаў у адзін сеанс.